ЯК ЛЕЧАЦЬ
АД ЗАЛЕЖНАСЦІ

Сямейная клініка

КАХАННЕ,
ЖЫЦЦЁ І ПЕСНІ
ПА-ІНДЫЙСКУ

Сямейная клініка

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

17 СНЕЖНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 246 (29360)

ЦЫТАТА ДНЯ

Мікалай ШЧОКІН, кандыдат філасофскіх навук, загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН:

«Мадэрнізацыя Канстытуцыі і правядзенне Усебеларускага народнага сходу — гэта толькі этап, пачатак шляху руху наперад. У будучыні нас чакае вялікая, карпатлівая і нярэдка цяжкая праца як над самімі сабой, так і над фарміраваннем новай беларускай мадэлі развіцця. Галоўнае — эканамічная эфектыўнасць і бяспека. А лейтматывам усіх намаганняў беларускага народа павінна стаць пытанне захавання краіны і гістарычнай памяці».

КАРАТКА

- Аляксандр Лукашэнка павіншаваў супрацоўнікаў Гомельскага абласнога клінічнага анкалагічнага дыспансера з 75-годдзем са дня заснавання ўстановы.
- **Авіякампанія «Белавія» працягнула прыпыненне рэйсаў ва ўсе пункты Расіі (акрамя маскоўскага аэрапорта Дамадзедава) да 31 студзеня 2021 года ў сувязі з адсутнасцю дазволу з боку РФ.**
- Адзіны кол-цэнтр па пытаннях водазабеспячэння запрацаваў у Мінску і Мінскай вобласці. Бясплатныя званкі прымаюць па кароткім нумары 119.
- **Каля дзвюх тысяч сувеніраў падрыхтуюць у бабруйскім каледжы да навагодніх свят.**
- Новую пагранзаставу «Альманы» адкрылі на граніцы з Украінай.

Ручная настраёвая работа

Фота БелТА.

У навучэнцаў Бабруйскага дзяржаўнага каледжа імя А. Ларына гэтым часам праходзяць цікавыя практычныя заняткі: юныя майстры працуюць над стварэннем мастацкіх вырабаў да навагодніх свят. Каля дзвюх тысяч мастацкіх вырабаў розных відаў і памеру зробяць маладыя ўмельцы. Кацярына СКАЛАБАН і Настасся ЧАЙКОЎСКАЯ *(на фота)* «чаруюць» над сімваламі Новага года — заўсёдным і надзённым.

На слыху!

Пільнасць, маскі і дыстанцыя

Як засцерагчы сябе ад небяспечнага захворвання і не сапсаваць навагодні настрой

Пра гэта і не толькі ў размове з намеснікам галоўнага ўрача Магілёўскай інфекцыйнай бальніцы, галоўным пазаштатным інфекцыяністам галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Магілёўскага аблвыканкама Ірынай БАС.

СТАР. 4

Парламенцкі дзённік

Навацыі ў заробках і «канстытуцыя» для бізнесу

Змяняюцца разлікі мінімальнай заработнай платы

Яна будзе не ніжэйшая за 30 працэнтаў прагнознага значэння сярэдняга заробку па краіне на чарговы год. Ключавая роля пры вызначэнні мінімальнага заробку адводзіцца Нацыянальнаму савету па працоўных і сацыяльных пытаннях. Яе памер будзе штогод устанаўлівацца ўрадам па прапановах гэтага органа. Такія навацыі ў праект змянення законаў па пытаннях сацыяльных нарматываў і мінімальнай заработнай платы прынялі ў першым чытанні дэпутаты Палаты прадстаўнікоў на чарговым пасяджэнні чацвёртай сесіі сёмага склікання.

СТАР. 2

Кожны дзень – са «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2021 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы

ISSN 1990 - 763X

Навацыі ў заробках і «канстытуцыя» для бізнесу

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Падыходы да ўстанаўлення мінімальнай заработнай платы, што прапаноўваюцца, накіраваны на павышэнне сацыяльнай абароны работнікаў і недапушчэнне зніжэння дасягнутага мінімальнага дзяржаўнага сацыяльнага стандарту ў галіне аплаты працы», — сказала **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ,** калі прадстаўляла законапраект.

Алег СЕМЯНЧУК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях, адзначыў, што цяпер мінімальная заработная плата разлічваецца з улікам мінімальнага спажывецкага бюджэту, прапаноў прафсаюзаў, інфляцыі і іншых паказчыкаў. «Цяпер яе памер будзе дакладна ўстаноўлены не ніжэй за 30 працэнтаў (прагнозная значэння сярэдняга заробку па краіне на чарговы год — **«Зв.»**). Калі эканамічны стан нашых прадпрыемстваў дазваляе больш, то будзе больш», — падкрэсліў парламентарый.

Праектам змянення законаў прадугледжваецца адмена паняцця мінімальнага спажывецкага бюджэту. Гэта дазволіць пазбегнуць блытаніны паміж паняццямі «бюджэт пражытачнага мінімуму» (БПМ) і «мінімальны спажывецкі бюджэт» (МСБ). «На практыцы для вырашэння пастаўленых задач сацыяльнай палітыкі прымяняецца ў асноўным бюджэт пражытачнага мінімуму. Мінімальны спажывецкі бюджэт выступае як крытэрый устанаўлення мінімальнай заработнай платы, давання льготных крэдытаў для будаўніцтва жылля і ў рамках устанаўлення заработнай платы работнікаў апарату кіравання юрыдычных асоб, якія не забяспечваюць своечасовае вяртанне крэдытаў», — расказала Ірына Касцевіч і дадала, што адмена МСБ не справакуе сур'ёзных змяненняў у заканадаўстве.

Выплаты і іншыя дапамогі будуць устанаўлівацца прапарцыянальна памеру бюджэту пражытачнага мінімуму. «Такі падыход апраўданы і з той прычыны, што бюджэт пражытачнага мінімуму вызначаны як крытэрый аднясення грамадзян да малазабяспечаных. Прымаючы да ўвагі, што ён разлічваецца па розных сацыяльна-дэмаграфічных групах, гэта дазволіць пры рэалізацыі дзяржаўнай падтрымкі максімальна ўлічваць прынцып адраснасці», — паведаміла міністр.

Па словах Ірыны Касцевіч, законам мяркуецца таксама змяніць тэрмін перагляду бюджэту пражытачнага мінімуму з пяці гадоў да трох.

Дарэчы, з пераліку сацыяльна-дэмаграфічных груп для разліку БПМ выключаць студэнтаў. Умоўны студэнцкі ўзрост уваходзіць у працаздольны, і іх даходы не абмяжоўваюцца выключна стыпендыямі.

Яшчэ адзін законапраект у сацыяльнай сферы, які разгледзелі дэпутаты ў сераду, датычыўся ўзносаў у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Па словах **Валерыя СТРАЛЬЧОНКА, члена Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях,** галіну рэгулюе мноства нарматыўна-прававых актаў і неабходна была іх сістэматызацыя.

«Сярод новаўвядзенняў — выкарыстанне аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы выканання грашовых абавязкаў як плацельшчыкамі ўзносаў, так і органамі фонду для спагнання ўзносаў», — сказаў дэпутат.

Уводзяцца новыя катэгорыі плацельшчыкаў узносаў у фонд сацабароны — арганізацыі, што забяспечваюць салдат тэрміновай службы, самазанятыя грамадзяне. Таксама да тых, хто працуе, будуць адносіцца асобы, што знаходзяцца ў лячэбна-працоўных прафілакторыях, месцах пазбаўлення волі, калі яны выконваюць работу, якая аплачваецца.

У другім чытанні Палата прадстаўнікоў прыняла змяненні ў Закон аб гаспадарчых таварыствах. **Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Анатоль НАСЕНЯ** канстатаваў, што праект дакумента — свайго роду «канстытуцыя» для бізнесу краіны, ён накіраваны на спрашчэнне прыцягнення інвестыцый у прыватны сектар і эканоміку краіны ў цэлым. Законапраектам павышаецца празрыстасць дзейнасці ААТ — яны павінны абавязкова раскрыць звесткі са стратэгіі свайго развіцця і іншых планавых дакументаў у СМІ і інтэрнэце. Мяркуецца, што гэта станоўча паўплывае на цікаўнасць інвестараў да такіх прадпрыемстваў.

Змены, якія прапануюцца ў заканадаўстве, закрануць аздараўленне гаспадарчых таварыстваў: у статут магчыма будзе ўнесці маёмасць, якая не павялічыць статутны фонд, даецца магчымасць разлічвацца з пазыкамі шляхам выпуску акцый ці паёў.

«Дадзеныя новаўвядзенні будуць запатрабаваны гаспадарчымі таварыствамі, якія маюць фінансавыя цяжкасці на бягучым этапе, але пры гэтым маюць перспектывы развіцця і, самае галоўнае, у выжыванні якіх зацікаўлены заснавальнікі і крэдыторы», — заявіў парламентарый.

Таксама абноўлены закон дасць магчымасць праводзіць пасяджэнні акцыянераў і наглядальных саветаў таварыстваў дыстанцыйна.

Марыя ДАДАЛКА.

Сацыяльны ракурс

ІНКЛЮЗІЎНЫ ПАДЫХОД

Атрымаць прафесію цяпер можна і дыстанцыйна

У Беларусі больш за 70 % дзяцей з асаблівасцямі развіцця навучаецца ў інтэграваных класах. Астатнія 30 % — ва ўстановах спецыяльнай адукацыі. Такіх налічваецца ў краіне 237: гэта спецыяльныя дашкольныя ўстановы, спецыяльныя школы і цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі.

НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Як паведаміла падчас круглага стала ў БелТА **галоўны спецыяліст упраўлення дашкольнай адукацыі Міністэрства адукацыі Алена МУЛІЦА,** агульная колькасць дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця зараз у краіне складае 170 468 чалавек (назіраецца тэндэнцыя да росту). Большая частка асаблівых дзяцей (60 %) маюць лёгкія парушэнні ў развіцці, а інваліднасць — 14 234 чалавекі.

Па словах спецыяліста, у Беларусі інтэграванае навучанне і выхаванне разглядаюцца як прыступка да інклюзіўнай адукацыі. «Вывучаючы вопыт шэрагу краін, мы бачым, што ў многіх з іх гэтыя паняцці прыраўноўваюцца. Мы ідзём крыху іншым шляхам і разглядаем інтэграванае навучанне і выхаванне як паралельнае навучанне з аднагодкамі са звычайным развіццём. А інклюзіўную адукацыю — як сумесную для ўсіх, калі ўлічваюцца асаблівасці кожнага дзіцяці незалежна ад таго, ёсць у яго парушэнні ці няма, калі ўсе дзеці навучаюцца разам, у працэсе вучобы выкарыстоўваюцца адны і тыя ж навучальныя дапаможнікі, праграмы і планы, — растлумачыла Алена Муліца. — Дзейнасць Міністэрства адукацыі і ўвогуле сістэмы адукацыі накіравана на тое, каб фарміраваць і развіваць інклюзіўную культуру ў кожнага ўдзельніка адукацыйнага працэсу».

Па словах **начальніка аддзела Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Алены ФАЛЕВІЧ,** ва ўстановах, у якіх рэалізоўваюцца адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, ствараюцца спецыяльныя ўмовы для таго, каб падлеткі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця маглі атрымаць прафесійную адукацыю. Ёсць магчымасць такім хлопцам і дзяўчатам навучацца альбо ў спецыяльных групах, альбо ў інклюзіўных. У апошні час колькасць інклюзіўных навучальных груп павялічваецца. Акрамя таго, на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі ёсць магчымасць навучацца дома падлеткі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Гэта адкрывае дадатковыя магчымасці для людзей з парушэннямі апорна-рухальнага апарату.

Па словах Алены Фалевіч, на базе Магілёўскага дзяржаўнага эканамічнага прафесійна-тэхнічнага каледжа арганізавана эксперыментальная пляцоўка для навучэнцаў з такімі парушэннямі. Навучанне праводзіцца з максімальным выкарыстаннем дыстанцыйнага навучання. Яго ўжо прайшлі восем чалавек. «Два з іх атрымалі чырвоны дыплом, астатнія маюць сярэдні бал каля «8». Двое выпускнікоў працаўладкаваныя. Шасцёра іншых паступілі на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі і працягваюць навучанне ў гэтым каледжы ўжо ў навучальных групах сумеснага навучання», — падкрэсліла начальнік аддзела.

Адна з важных асаблівасцяў арганізацыі навучання на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі — абавязковае размеркаванне. «Проста даць прафесію — не самамэта. Важна, каб выпускнік з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, атрымаўшы прафесію, змог яшчэ і рэалізавацца ў прафесійнай дзейнасці», — дадала Алена Фалевіч.

ГАТОЎНАСЦЬ ПЕДАГОГАЎ

Дырэктар Інстытута інклюзіўнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта Вера ХІТРУК лічыць, што кожны педагог павінен быць гатовы да працы з дзецьмі з асаблівымі адукацыйнымі патрэбамі.

Фота БелТА.

«Змянілася прафесійная сітуацыя. І сёння ніводны настаўнік і выхавальнік установы дашкольнай адукацыі не застрахаваны ад таго, што ў яго ў групе ці класе ў любы час можа апынуцца дзіця з тымі ці іншымі адукацыйнымі патрэбамі. Неабавязкова дзіця з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Наш інстытут якраз і працуе над змяненнем зместу педагагічнай адукацыі», — падкрэсліла Вера Хітрук.

Па яе словах, пастаянна ўдасканальваецца практычная падрыхтоўка будучых дэфектолагаў. «Мы ўводзім новыя навучальныя дысцыпліны, дапаўняем змест ранейшых. Акрамя таго, гаворка ідзе пра змену разумення кожным педагагічным работнікам таго, што дзіця з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця — гэта аб'ект асаблівай увагі», — адзначыла дырэктар.

Вера Хітрук расказала, што Міністэрства адукацыі разам з ЮНІСЕФ пачынае распрацоўку вялікага праекта па інклюзіўнай адукацыі, разлічанага на тры гады. «Адна з задач — гэта падрыхтоўка педагагічных кадраў. На ўзроўні другой ступені вышэйшай адукацыі ў нас плануецца адкрыць спецыяльнасці магістратуры па ранняй комплекснай дапамозе, па арганізацыі дзейнасці псіхолага-медыка-педагагічнай камісіі. Яе дзейнасць сёння падлягае перагляду і падрыхтоўцы новых арганізацыйных і змястоўных умоў. Яшчэ адзін аспект — работа з непажаданымі паводзінамі. Маецца на ўвазе падрыхтоўка спецыялістаў да работы з дзецьмі з расстройствамі аўтыстычнага спектра менавіта ў магістратуры», — падкрэсліла яна.

Дарэчы, Рэспубліканскі рэсурсны цэнтр інклюзіўнай адукацыі, створаны пры БДПУ ў 2017 годзе, праводзіць курсы для педагогаў. На сёння распрацавана 113 такіх курсаў і яны запатрабаваныя.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ІНВЕСТЫЦЫІ Ў БУДУЧЫЯ ПОСПЕХІ

Прэзідэнцкі спартыўны клуб зацвердзіў 306 стыпендыятаў

Цэнтральны савет Прэзідэнцкага спартыўнага клуба ў завочнай форме зацвердзіў 306 стыпендыятаў з ліку перспектыўных беларускіх спартсменаў і трэнераў.

Улічваючы, што праз пандэмію не ўсе спартсмены ў 2020 годзе змаглі ўзяць удзел у буйных міжнародных спаборніцтвах і паказаць кваліфікацыйны вынік для пападання ў лік удзельнікаў праекта, большасць стыпендый прызначана асобным рашэннем цэнтральнага савета. У гэтым выпадку зважалі на ўдзел спартсмена ва ўнутраных спаборніцтвах, ранейшыя выступленні на міжнародным узроўні, меркаванні трэнераў і спецыялістаў, хадайніцтвы пэўных спартыўных федэрацый, асацыяцый і саюзаў.

У праекце на 2021 год прадстаўлены 35 відаў спорту. Упершыню сярод стыпендыятаў прысутнічаюць прадстаўнікі веласіпеднага спорту BMX і МВТ, якія ўваходзяць у алімпійскую праграму. У будучым годзе атрымліваць фінансавую падтрымку будуць адразу дзве валейбольныя каманды, якія паспяхова выступілі на юніёрскіх чэмпіянатах Еўропы.

Сярод стыпендыятаў-трыумфатараў міжнародных спаборніцтваў адзначаны чэмпіёнкі Еўропы сярод юніёраў у акадэмічным веславанні Віялета Дзмітрыева (адзіночка) і Дар'я Вырупаева з Настассяй Русак (двойка парная). Фінансавую падтрымку таксама будуць атрымліваць трыумфатары юнацкіх Алімпійскіх гульняў — чэмпіён па хакеі з шайбай Ілья Корзун і бронзавы прызёр у біятлоне Юлія Кавалеўская. У лік стыпендыятаў увайшла і Анна Дзяруга, пераможца агульнага заліку Кубка Еўропы па фрыстайле ў сезоне 2019/2020.

У афіцыйным прэс-рэлізе Прэзідэнцкага спартыўнага клуба сказана, што прадстаўнікі асноўнага саставу нацыянальных каманд з 2019 года не ўдзельнічаюць у праекце выплаты стыпендый. Увага акцэнтавана на юнакоў і дзяўчат, якія толькі пачынаюць сваю спартыўную кар'еру. Сёлета сярэдні ўзрост стыпендыятаў — рэкордна юныя 16 гадоў, трэнераў — 29 гадоў.

Сярэдні памер гадавой стыпендыі — 6900 беларускіх рублёў у год (па 575 рублёў у месяц). Агульная сума выплат у 2021 годзе складзе больш за два мільёны беларускіх рублёў. Яна будзе выплачвацца спартсменам і трэнерам увесь год, пачынаючы са студзеня 2021 года. Прэзідэнцкі спартыўны клуб супрацоўнічае з адным з беларускіх банкаў. Стыпендыяты могуць выкарыстоўваць аплатную бескантактавую картку міжнароднай сістэмы з унікальным дызайнам і павышаным кэшбэкам на спартыўныя тавары.

У розны час стыпендыятамі Прэзідэнцкага спартыўнага клуба былі алімпійскія чэмпіёны Надзея Скардзіна, Дзінара Алімбекава, Ірына Крыўко, Ганна Гуськова, Уладзіслаў Ганчароў і многія іншыя. Праграма стыпендый у пэўнай ступені аказалася для іх дапамогай на шляху да алімпійскіх вяршынь.

Валерыя СЦЯЦКО.

З нагоды

Гадзіннік для тэатралаў

Мінскі гадзіннікавы завод «Луч» выпусціў лімітаваную калекцыю гадзіннікаў «Асоба». Яна прысвечана аднаму з заснавальнікаў беларускага прафесійнага тэатра, акцёру і рэжысёру Фларыяну Ждановічу.

Новая калекцыя налічвае сто экзэмпляраў. У кожнага ёсць свой парадкавы нумар, размешчаны на адваротным баку гадзінніка. Адзін экземпляр завод перадаў у якасці экспаната ў Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры — там ёсць асобная экспазіцыя, прысвечаная вядомаму акцёру.

Характэрна, што цыферблат выкананы ў колеры заслоны Купалаўскага тэатра — глыбокім бардовым. Так дызайнеры вырашылі звязаць гісторыю і сучаснасць беларускага тэатра. Менавіта пад кіраўніцтвам Фларыяна Ждановіча ў 1920 годзе адкрыўся Беларускі дзяржаўны тэатр (цяпер Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы), дзе ён быў мастацкім кіраўніком і акцёрам.

Малюнак тэатральнай заслоны на гадзінніку ўзяты з вокладкі кнігі, дзе ўпершыню была апублікавана п'еса Янкі Купалы «Паўлінка», пастаўленая Ждановічам. Цыферблат таксама ўпрыгожваюць рымскія лічбы, тэатральны бінокль і маскі.

— Калекцыя «Асоба» створана, каб нагадаць беларусам пра імёны дзеячаў культуры і мастацтва, якія аказаліся незаслужана забытыя. Серыя гадзіннікаў, прысвечаных Фларыяну Ждановічу, ужо другая з калекцыі «Асоба». У снежні 2019 года завод выпусціў абмежаваную серыю гадзіннікаў па матывах работ самабытнай беларускай мастачкі Алены Кіш, — расказвае Іван Краўчэня, арт-дырэктар Мінскага гадзіннікавага завода.

Сяргей КУРКАЧ.

Радзіннае

КАЛЯДЫ ПА-АСТРАМЕЧАЎСКУ

Убачыў свет чарговы, чацвёрты па ліку ў 2020-м годзе (выданне прыходзіць да чытача адзін раз у квартал), выпуск брэсцкага раённага краязнаўчага альманаха «Астрамечаўскі рукапіс».

Краса нумара — раздзел «Чароўныя спевы і паданні спадчыны». «Каляды» — публікацыя, якая звяртае ўвагу да цыкла свят і абрадаў зімовага сонцазвароту. «Адраджэнне» сонца — пачатак новага сонечнага, а разам з ім і аграрнага года (яно абяцала прыход цяпла і святла, прабуджэнне пладаноснай сілы зямлі). Звычай святкавання Новага года таму і з'яўляецца для сялян адным з самых значных каляндарных свят. У гэты перыяд з асаблівай сілай разгортваюцца магічныя абрады ўрадлівасці, якія суправаджаюцца песнямі, танцамі, забавамі», — як з гэтым не пагадзіцца?! Чытачы «Астрамечаўскага рукапісу» атрымліваюць магчымасць зазірнуць у берасцейскую вёску Гута, з якой карэспандэнтамі па каляднай тэме выступаюць жыхары нараджэннем 1930—1944 гадоў, — Кацярына Якімаўна Качалоўская, Вера Якаўлеўна Каранчук, Вольга Іванаўна Качалоўская, Лідзія Іванаўна Мацкевіч, Кацярына Іванаўна Сац, Марыя Сцяпанаўна Аляксеева, Кацярына Пятроўна Супрунюк. Дарэчы, тэксты раздзелу «Каляды» варта прачытаць і ў школе арганізатарам выхаваўчай работы. Бо ў іх — і пра мясцовыя народныя гульні: «Каляды», «Шчадруха», пра сваволькствы моладзі і калядныя абходы. Як не ведаць моладзі, падлеткам вось гэта: «Мы прызнавалі Каляду. А на 13-е прызнавалі Шчодрык. У нас Калядой не звалы. То хадылы большэнство. Ходылы і ўзрослые...» І яшчэ: «І ўжэ под окно подойдыть і спеваюць Шчодрыця. І ўжэ выносяць бліна. Тады кроме бліна ныц не давалы. На Шчодрыка, гэта было 13-е, бліны давалы, ны было ныц, ні канфет, нічога. Хто даст кусочак калбаскі ілі кусочак сала, або бліна памазаны, чы маслом, чы салом — гэто ўжэ як кто...»

Чарговы выпуск краязнаўчага альманаха багаты на публікацыі гераіка-патрыятычнага характару (на ваенныя тэмы — і раздзел адпаведны: «Беларусь памятае»). Па традыцыі «Астрамечаўскі рукапіс» уважлівы да праваслаўнай праблематыкі. Відавочна, што рэдактар і ўкладальнік выдання, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандр Валковіч разважліва, грунтоўна пазіцыяную абсягі праваслаўнага краязнаўства, імкнецца знайсці і ў гэтым кірунку многія важкія драбніцы памяці.

Ізноў даводзіцца выказваць шкадаванне, што работа гісторыка-краязнаўчага характару на рэгіянальным узроўні не дужа заўважана. Пра гэта сведчыць і наклад выдання, якім апякуецца Брэсцкі раённы выканаўчы камітэт. Да яго істотнай падтрымкі далучыць бы нашмат больш шырокую ўвагу... «Астрамечаўскі рукапіс» гэтага, несумненна, варты.

Сяргей ШЫЧКО.

Слова — чытачам

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

НЕ ЛЮБЛЮ РАСПУШЧАНАСЦЬ, РАСХЛЯБАНАСЦЬ І НЯВЫХАВАНАСЦЬ...

Аляксандр ЛАПАЦЕНТАЎ, старшыня СВК «Калгас «Радзіма» Бялыніцкага раёна, аб прыярытэтах у атрыманні інфармацыі.

— Я чалавек старой закваскі, рабочы дзень пачынаю і заканчваю менавіта газетамі. Усім нашым калгаснікам мы выпісваем шмат газет за кошт гаспадаркі. Самыя любімыя выданні — сельскія, якія пішуць пра нашу тэматыку. Не люблю інтэрнэт. Сёння там хто што хоча, тое і балбоча. Гэта не дэмакратыя, гэта — распушчанасць, расхлябанасць і нявыхаванасць. Пішуць хто як папала. Для мяне самая дакладная крыніца інфармацыі — газета. Я не лягу спаць, пакуль не перагляджу іх. Таму я і нашым калгаснікам іх выпісваю. Хачу, каб людзі чыталі. І бачу, хто чытае.

Перш за ўсё «лаўлю» практычны бок жыцця нашай краіны. У сельскіх газетах заўсёды шукаю інфармацыю, як жывуць гаспадаркі ў нашай і іншых абласцях. Улічваючы, што большасць з іх — і слабыя, і моцныя — ведаю асабіста, цікаўлюся, як яны трымаюцца. Адсочваю, якія падзеі адбываюцца ў краіне. Мне здаецца, што не трэба нам гнацца за лічбамі, бо ў гэтай гонцы мы не бачым людзей. Ва ўсе часы мы, старыя кадры, цікавіліся, хто чым дыхае ў раёне, вобласці, якія паказчыкі, людзі за імі стаяць. Мала мы пра іх пішам і мала паказваем па тэлевізары. Затое ўсякай нізкапробнай інфармацыі — колькі заўгодна. Гэта не наш метад выхавання. Для мяне цікава пачытаць, як уводзяць у строй новы кароўнік, дзіцячы садок, калі паказваюць і расказваюць аб працавітых людзях, якія дасягнулі поспехаў у рабоце, як іх адзначылі, узнагародзілі. Вось для чаго патрэбны сродкі масавай інфармацыі. Пагадзіцеся, калі той працаўнік убачыць свой партрэт у газеце, яму захочацца яшчэ лепш працаваць. Гэта ж моцны стымул.

Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.

А не шкодзь!

ПАСПРАБАВАЛІ ЗДАЦЬ НА ВЕТАНАЛІЗ МЯСА ДЗІКА

Вельмі здзівіліся супрацоўнікі ветэрынарнай станцыі Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці, калі адзін з вяскоўцаў прынёс ім на аналіз мяса... дзіка. У адпаведнасці з асаблівым рэжымам канфіскацыі гэтага віду (з мэтай прафілактыкі распаўсюджвання афрыканскай чумы) разбіраць тушы здабытых дзікоў забараняецца, іх трэба ўтылізаваць у спецыяльных месцах, нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету.

Наведвальнік зразумеў, што трапіў у няёмкае становішча, і літаральна збег з ветлабараторыі. Аднак ветурачы паставіліся да гэтага здарэння адказна і паведамілі пра магчымую незаконную здабычу і разбор дзіка, тым больш што парушальнік прыязджаў на прыкметным аўтамабілі, які яны апісалі інспектарам Светлагорскай міжрайінспекцыі. Тыя з дапамогай міліцыі ўстанавілі, што ўладальнік падобнага аўто пражывае ў вёсцы Чырвоная Слабада Рэчыцкага раёна, і разам з участковым адправіліся да яго. Па іроніі лёсу гэты аўтамабіль сустрэўся ім па дарозе, у салоне меліся сляды крыві.

Адпірацца вясковец не стаў і расказаў, што разам з сябрамі разабраў маладога дзіка, які нібыта патануў у канале. Аб незаконнасці сваіх дзеянняў яны падазравалі, але спадзяваліся выдаць мяса за мяса свойскай свінні. Фокус не атрымаўся, сяброў-браканьераў чакае штраф.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Калядка Таццяне Іванаўне, кіраўніку адміністрацыі Маскоўскага раёна г. Мінска, у сувязі са смерцю мужа.

Дзяржаўнае аб'яднанне «Гаражы, аўтастаянкі і паркоўкі» глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю дырэктара дзяржаўнай установы «Паркоўкі сталіцы» КАЛЯДКІ Анатоля Уладзіміравіча і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім. Светлая памяць пра Анатоля Уладзіміравіча назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

2,7 мільярда чалавек неабаронены падчас пандэміі

Новае даследаванне міжнароднага аб'яднання Oxfam паказала, што звыш трэці насельніцтва планеты не мае ніякай дзяржаўнай дапамогі, каб справіцца з наступствамі пандэміі. У цэлым, сёлета свет выдаткаваў дадаткова 9,6 трыльёна еўра на тое, каб справіцца з наступствамі пандэміі каранавіруса, паведаміў Euronews. З гэтай сумы 83 % было выдаткавана 36 багатымі краінамі супраць усяго 0,4 % у 59 краінах з нізкім узроўнем даходу. На дадатковыя грашовыя сродкі, выдзеленыя спецыяльна на праграмы сацыяльнай абароны, 28 багатых краін выдаткавалі 695 долараў на чалавека. А ў краінах з нізкімі даходамі і ў тых, дзе фарміруецца рыначная эканоміка, адпаведныя выдаткі склалі ад 28 да чатырох долараў. «Каранавірус аб'яднаў свет страхам, але ў астатнім раскалоў яго», — заўважыла Габрыела Бухер, выканаўчы дырэктар Oxfam. Спецыялісты лічаць, што патрэба ў паляпшэнні праграм сацыяльнай абароны для дапамогі людзям велізарная: паўмільярда чалавек цяпер апынуліся без работы або занятыя толькі часткова.

Еўракамісія ўнесла «УКантакце» і Telegram у «пірацкі спіс»

Еўрапейская камісія ўключыла ў спіс рэсурсаў, якія спрыяюць распаўсюджванню пірацкага кантэнту, расійскую сацыяльную сетку «УКантакце» і месенджар Telegram. Спіс быў створаны ў 2018 годзе і змяшчае чатыры часткі: анлайн-сэрвісы, якія даюць або спрашчаюць доступ да пірацкага кантэнту, платформы для анлайн-гандлю, інтэрнэт-аптэкі і сэрвісы, якія распаўсюджваюць лекі, а таксама афлайнавыя гандлёвыя пляцоўкі. Згодна з дакументам, у карыстальнікаў «УКантакце» ёсць доступ да нелегальных фільмаў, у тым ліку праз убудаваны плэер, а таксама да кніг. Уключэнне Telegram у спіс тлумачыцца тым, што рэакцыя кіраўніцтва месенджара на скаргі праваўладальнікаў «неістотная».

У Конга пабудуюць маўзалей Патрыса Лумумбы

Маўзалей нацыянальнага героя Дэмакратычнай Рэспублікі Конга і ўсёй Афрыкі Патрыса Лумумбы будзе пабудаваны ў сталіцы краіны Кіншасе на працягу бліжэйшых сямі месяцаў. Пра гэта паведаміла кангалезская радыёстанцыя Digitalcongo са спасылкай на прэзідэнта рэспублікі Фелікса Чысекедзі. «Да святкавання 61-й гадавіны нашай незалежнасці краіна выкажа сваю падзяку Патрысу Лумумбе, — заявіў кіраўнік дзяржавы падчас сустрэчы з дэпутатамі нацыянальнага парламента. — Яму будзе, нарэшце, адведзена вартае месца для вечнага спакою. Мы абавязаны памятаць пра герояў, якія аддалі свае жыцці за наш народ». Па словах кіраўніка дзяржавы, маўзалей будзе пабудаваны да чэрвеня 2021 года. Фелікс Чысекедзі таксама заўважыў, што Бельгія верне астанкі Патрыса Лумумбы.

ДАПАМОГА РОДНАЙ СТАРОНЦЫ

Упершыню ў Беларусі студэнцкі валанцёрскі атрад Гомельскага дзяржмедуніверсітэта накіраваны на дапамогу ўрачам раённай бальніцы. Добраахвотнікі ў барацьбе з COVID-19 прыязджаюць у Рэчыцкую цэнтральную раённую бальніцу. Гэта студэнты лячэбнага факультэта Гомельскага дзяржмедуніверсітэта, ураджэнцы райцэнтра.

Гомельскі медуніверсітэт заключыў з Рэчыцкай ЦРБ дагавор аб бязвыплатнай дапамозе. Усе студэнты прайшлі адпаведнае навучанне, застрахаваны прафкамам студэнтаў і забяспечаны ахоўнымі сродкамі.

У Рэчыцкай бальніцы валанцёры працуюць у інфекцыйных аддзяленнях. Яны вымяраюць у пацыентаў аксігенацыю крыві, сочаць за правільным становішчам цела хворых на ложку, вучаць элементам дыхальнай і цяглічнай гімнастык. Таксама ў ліку працоўных задач будучых урачоў — асветніцкая работа і псіхалагічная падтрымка COVID-станоўчых пацыентаў. Як паказаў вопыт работы валанцёраў Гомельскага медуніверсітэта ў арганізацыях аховы здароўя абласнога цэнтра, менавіта такія аспекты меддапамогі найбольш запатрабаваныя. Цяпер валанцёры прыязджаюць у Рэчыцу на работу ў атрадзе кожныя выхадныя.

Між тым гэты валанцёрскі праект — ініцыятыва студэнтаў і дэкана факультэта «Лячэбная справа» Гомельскага дзяржмедуніверсітэта Дзмітрыя Радзько. У пачатку работы валанцёрскага атрада восем студэнтаў разам з дэканам прыбылі ў адно са структурных падраздзяленняў Рэчыцкай ЦРБ — педыятрычнае аддзяленне. Сёння тут 150 ложкаў адведзена для лячэння хворых з каранавіруснай інфекцыяй. Увогуле гэты райцэнтр для работы першага раённага валанцёрскага атрада быў абраны невыпадкова.

— Па-першае, Рэчыцкі раён, ды і Рэчыца, не самыя малыя па колькасці насельніцтва, — адзначыў **дэкан факультэта «Лячэбная справа» Гомельскага дзяржмедуніверсітэта Дзмітрый РАДЗЬКО.** — Да таго ж на факультэце ВНУ вучыцца нямала студэнтаў з Рэчыцы. Таму мы тут для таго, каб адказаць на пытанні пацыентаў, даць кансультацыю, паказаць практыкаванні, якія неабходна выконваць. Хворым, напрыклад, патрэбна цяглічная гімнастыка, нельга забываць аб дыхальнай. Валанцёры павінны гэта расказаць, паказаць і пераканаць пацыентаў, што ўсё будзе добра.

Дарэчы, дапамога студэнцкага атрада па барацьбе з COVID-19 — выключна дабрачынны праект. Усе студэнты прайшлі адпаведнае навучанне і забяспечаны ўсімі неабходнымі сродкамі індывідуальнай аховы з боку адміністрацыі раённай установы аховы здароўя.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота прэс-службы Гомельскага дзяржмедуніверсітэта.

Пільнасць, маскі і дыстанцыя

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Магілёўскія медыкі ацэньваюць сітуацыю па каранавірусе ў рэгіёне і абласным цэнтры як дастаткова напружаную і трывожную. Гэта сапраўды так? — спыталіся мы ў спецыяліста.

— Колькасць пацыентаў вялікая, — не хавае Ірына Сцяпанаўна. — Калі раней сярод насельніцтва існавала меркаванне, што цяжка хварэюць у асноўным людзі сталага ўзросту, цяпер мы бачым, што цяжка могуць хварэць і людзі дастаткова маладога ўзросту. І часам нават без спадарожнай паталогіі, але з вялікай вагой цела. І ў такіх маладых людзей захворванне працякае, як і ў сталых, дастаткова цяжка.

— Напярадзе святы. У якія раёны Магілёўскай вобласці не трэба ехаць, каб не падчапіць заразу?

— Святы — гэта цудоўна, але не забывайце, што гэта не апошні Новы год і не апошнія Каляды. Пры такой эпідабстаноўцы лепш застацца дома і правесці іх з тымі блізкімі, з якімі мы жывём у адной кватэры. Любыя пабочныя кантакты павышаюць рызыку захворвання. За сталом у масцы сядзець не будзеш.

— Ёсць меркаванне, што калі ўжываеш алкаголь, COVID-19 цябе не закране...

— Калі мы выкарыстоўваем спіртазмяшчальныя антысептыкі і дэзсродкі, гэта не значыць, што трэба ўжываць моцныя напоі. Гэта не застрахуе ад віруса. Наадварот, чалавек страчвае кантроль, і рызыка падхапіць хваробу ўзрастае.

— Трывогу выклікае, што паміраюць людзі крыху за 50, якія вялі здаровы спосаб жыцця і не скардзіліся на дрэннае самаадчуванне...

— На жаль, ад гэтага ніхто не застрахаваны. Усё залежыць ад многіх фактараў — генетычных асаблівасцяў, віруснай нагрузкі, наяўнасці спадарожных захворванняў. У тых, каму за 50, ужо ёсць, як правіла, артэрыяльная гіпертэнзія, шмат у каго цукровы дыябет. А гэта павялічвае пагрозу захварэць цяжка.

— У Беларусі ёсць невялікая колькасць людзей, якія выпрабоўваюць расійскую вакцыну. Можна казаць пра нейкія першыя вынікі?

— Так, у Беларусі ёсць шэраг асоб, якія ўвайшлі ў групу для клінічных выпрабаванняў расійскай вакцыны. Аднак павінен прайсці час, каб пераканацца, што гэта вакцына дзейсная.

— На колькі хапае натуральнага імунітэту, калі ты ўжо перахварэў?

— Такой гарантыі няма. Імунітэт выпрацоўваецца ў большасці людзей, але, на жаль, паўторныя выпадкі інфіцыравання існуюць. І часам паўторныя працякаюць дастаткова цяжка, цяжэй, чым у першым выпадку. У кожнага імунная сістэма свая, ёсць пэўныя асаблівасці. Часам імунітэт, які выпрацоўваецца, не трывалы, і чалавек пры паўторнай сустрэчы з вірусам захворвае. Мы разлічваем на тое, што імунітэт павінен захоўвацца паўгода, але ў некаторых яго хапае на месяц—тры.

— Шмат хто скардзіцца на недасканаласць дыягностыкі. У чалавека ўсе прыкметы захворвання ёсць, а аналіз адмоўны. Прычына ў зменлівасці віруса або ў нечым іншым?

— Мы павінны разумець, што любы вынік аналізу мы павінны сувымяраць з клінічнай карцінай. Інфарматыўнасць таго ж ПЛР-даследавання дакладная толькі на 60 %. Гэта залежыць ад шматлікіх фактараў — ад збору матэрыялу, транспарціроўкі, колькасці віруса. Калі мы назіраем у пацыента «клініку» двухбаковай пнеўманіі, робім РКТ органаў грудной клеткі і бачым тыповую карціну ковіднай пнеўманіі, але пры гэтым атрымліваем адмоўны вынік ПЛР, то дыягназ каранавіруснай інфекцыі не здымаем, пазначаем толькі, што ён клініка-рэнтгеналагічны. Асноўнае — гэта «клініка», лабараторныя даследаванні павінны сувымярацца з клінічнай карцінай. Што датычыцца тэстаў на антыцелы, то трэба разумець, калі ўзяць кроў для праверкі на іх наяўнасць у пацыента, які толькі захварэў, вынік будзе адмоўны. Імунная сістэма выпрацоўвае антыцелы не імгненна. Каб з'явіліся імунаглабуліны М, павінна прайсці мінімум сем дзён, у некаторых яны з'яўляюцца толькі на 10-ы і нават 14-ы дзень. Адным словам, калі чалавек захварэў, рабіць аналіз крыві на антыцелы ў першыя сем дзён бессэнсоўна. Яны не выпрацоўваюцца ў сувязі з асаблівасцямі нашай імуннай сістэмы. Таму вельмі важна ведаць, што кожны аналіз павінен назначаць урач. Ён жа павінен даваць і інтэрпрэтацыю гэтых аналізаў, з улікам «клінікі» і іншых даных — аналізу крыві, у тым ліку біяхімічнага, і гэтак далей. Такога, што захацеў праверыць кроў на антыцелы — пайшоў і здаў, быць не павінна. Інакш можна страціць пільнасць і прыняць COVID за ВРЗ.

— А калі чалавек вырашыў падстрахавацца і зрабіць КТ?

— Гэта магчыма, толькі калі ёсць накіраванне ўрача. КТ — гэта метад даследавання, а не метад лячэння. Калі чалавеку робяць рэнтген і бачна, што ў яго пнеўманія, навошта рабіць КТ? Іншая справа, калі чалавеку зрабілі рэнтген, змен не выявілі, а тэмпература падымаецца, захоўваецца кашаль, дрэннае самаадчуванне, пры гэтым тэст ПЛР адмоўны, канешне, доктар прызначыць КТ. І трэба разумець, што калі зрабіць КТ у першы дзень захворвання, нават на другі, а магчыма і трэці, змен у лёгкіх можна і не заўважыць. Зноў жа такі чалавек супакойваецца, маўляў, у яго хваробы няма. А калі зрабіць КТ на пяты-шосты дзень, там ужо будуць змены. Так развіваецца хвароба. Проста ў першы-другі дзень пнеўманія была рэнтгеналагічна не бачная. Абследаванне назначае не пацыент сабе, а ўрач.

— Мы ўсе ведаем меры прафілактыкі, але не лішнім будзе яшчэ раз пра іх нагадаць.

— Насельніцтва павінна вельмі сур'ёзна ставіцца да захавання элементарных мер прафілактыкі, якія вельмі дзейсныя. Гэта нашэнне масак, асабліва ў месцах знаходжання вялікай колькасці людзей. Масачны рэжым, які спачатку пачаў дзейнічаць у Магілёве, а пасля і па ўсёй рэспубліцы, быў уведзены не проста так. Таму ў крамах, грамадскім транспарце, месцах, дзе шмат людзей, мы павінны насіць маскі. Акрамя гэтага, усе павінны захоўваць сацыяльную дыстанцыю. Метр-паўтара — гэта менавіта тая адлегласць, якая дазваляе мінімізаваць перадачу віруса. І не трэба забываць пра гігіену рук — іх неабходна мыць вельмі старанна з мылам, а калі такой магчымасці няма, апрацоўваць ахоўным антысептычным сродкам. Неабходна таксама як мага часцей праветрываць памяшканне, асабліва калі там знаходзіцца больш за тры чалавекі. Нагадаю, што дзеці могуць з'яўляцца бессімптомнымі пераносчыкамі інфекцыі і пераносіць хваробу без «клінікі», або з мінімальнымі яе праявамі. Пры гэтым яны будуць з'яўляцца крыніцай інфекцыі для сваіх бацькоў, або, што яшчэ больш небяспечна, дзядуль і бабуль. Таму трэба скарачаць кантакты дзяцей з пажылымі сваякамі.

— Некаторыя, каб не захварэць, п'юць розныя антывірусныя сродкі. Ці правільна гэта?

— У свеце не распрацавана ніводнага супрацьвіруснага сродку, які б уздзейнічаў на COVID-19. Яго няма. Усе тыя лекавыя прэпараты, якія выкарыстоўваюцца, з'яўляюцца эксперыментальнымі. Некаторыя з іх часткова валодаюць супрацьвіруснымі ўласцівасцямі. Той жа прэпарат для лячэння ліхаманкі Эбола. У часткі пацыентаў ён паказаў сваю эфектыўнасць у раннія тэрміны захворвання. Іншыя лекавыя сродкі падаўляюць гіперімунны адказ, але іх прызначаюць тым пацыентам, у якіх ёсць пэўныя паказанні. Але дзейснага на 100 % прэпарата няма, інакш ужо б увесь свет вылечыўся. Мы маем вялікія спадзяванні на вакцыну, якая цяпер праходзіць выпрабаванні.

— А ці трэба купляць для ўласнага самазаспакаення прыборы для вымярэння сатурацыі?

— Здаровому чалавеку яны не патрэбны. Уладальнікі мабільных тэлефонаў могуць спампаваць праграмку для вызначэння сатурацыі і карыстацца ёй. Эфект той самы.

— Як часта адбываюцца пасяджэнні штаба па мінімізацыі рызык распаўсюджвання віруснай інфекцыі і аказанні дапамогі насельніцтву?

— Штабы створаны па даручэнні Прэзідэнта і каардынуюць работу ўсіх службаў, у тым ліку МУС, МНС, адукацыі і гэтак далей на мясцовым узроўні. Наш рэгіянальны штаб узначальвае старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід Заяц. Кожнаму ведамству даюцца даручэнні і прызначаюцца тыя шляхі, якія дапамагаюць нам спраўляцца з сітуацыяй. Штотыдзень на некалькі дзён у Магілёў прыязджаюць эксперты — прафесар кафедры інфекцыйных хвароб Беларускага дзяржаўнага медуніверсітэта Дзмітрый Данілаў і дацэнт кафедры анестэзіялогіі і рэанімацыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Уладзіслаў Рымашэўскі. Адзін дзень яны прысвячаюць кансультацыям у магілёўскіх бальніцах, а на другі мы апошнім часам выязджаем на раёны.

— Якія прагнозы існуюць па COVID-19? Кажуць, разнявольвацца нельга да чэрвеня.

— Разнявольвацца мы і не будзем. Спадзяемся, што ў найбліжэйшыя некалькі месяцаў выйдзем на плато.

— У інтэрнэце існуе інфармацыя, што ковід — гэта лабараторны вірус, накіраваны на знішчэнне значнай часткі насельніцтва Зямлі. А вы як лічыце?

— Адказ на гэтае пытанне дадуць вучоныя. Але па папярэдніх звестках гэта натуральны вірус.

Пытанні задавала Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Ірыны БАС.

УСЕ МЫ КРЫХУ ДЗЕЦІ

Днямі мой двухгадовы сын упершыню катаўся на санках. Апошнія, дарэчы, куплены дзве зімы таму — дзядуля з бабуляй марылі гуляць са сваім адзіным унукам менавіта такім чынам, захутаўшы малога ў цёплы пледзік. Не давялося. Для такіх прагулак Цёмік быў яшчэ замалы, а летась снегу было як кот наплакаў. Толькі на трэці Цёмаў год мы дачакаліся больш-менш нармальнай зімы...

Сёлета яна парадавала, не паспеўшы яшчэ пачацца. Як хораша, калі снег рыпіць пад нагамі! Вока радуецца, калі едзеш за рулём, а паабапал дарогі ўсё бялюткае-бялюткае! Нават Цёмік, які той снег бачыў амаль што толькі на малюнках ды па тэлевізары, выглянуўшы ў акно, сказаў: «Патрэбны санкі!» Праўда, дзянёк пакаталіся, і той снег як карова языком злізала.

З наступленнем зімы ўсе мы чамусьці чакаем цуду. Як малыя, радуемся першаму снегу, быццам менавіта ён павінен зацерушыць усе нашы няшчасці і праблемы, якія назапасіліся за цэлы год. Са з'яўленнем дзяцей (ва ўсялякім разе так у мяне) зімы чамусьці чакаеш больш, чым лета, а самым жаданым святам становіцца Новы год. Бо табе не сорамна выразаць сняжынкі і залепліваць імі ўсе вокны, не рана ўпрыгожваць ёлку ў самыя першыя дні снежня, не цяжка абвешваць «дожджыкам» і іншай драбязой усю кватэру, нават прыбіраць лесвічную пляцоўку перад уваходнымі дзвярыма — гэта ж усё дзеля дзіцяці! Толькі чамусьці баімся самі сабе прызнацца, што і нам, дарослым, гэта патрэбна, бо ў чаканні Новага года ўсе мы трошкі становімся дзецьмі.

Напярэдадні свят звычайна згадваюцца нашы дзіцячыя прыгоды, якія зімой былі асаблівыя. У дзевяностыя снегу было столькі, што мы не проста ляпілі снегавікоў, а будавалі з яго цэлыя «крэпасці». Аднойчы, акурат у першы дзень новага года, мы з сяброўкай так уцягнуліся ў адну такую «будоўлю», што страцілі кантроль над часам. Як потым аказалася, адсутнічалі мы гадзіны чатыры, а на вуліцы, між іншым, мароз! Але мы так захапіліся, што нам было горача. Мабільнікаў тады не мелі, таму мая матуля апранулася цяплей, «узброілася» нейкім калочкам і адправілася нас шукаць. Знаёмую постаць мы з Дашай убачылі здалёк, таму, каб не атрымаць па месцы ніжэй спіны тут жа, на вуліцы, вырашылі абходным шляхам пайсці дамоў самі. Аднак пакарання нам пазбегнуць усё ж такі не ўдалося...

А колькі радасці і смеху прыносіла адно толькі коўзанне з горкі! Пра ніякія цюбінгі ў маім дзяцінстве мы, канешне, не чулі. Іх ролю выконвалі звычайныя мяшкі з сенам. Каля горкі, найбольш у выхадны дзень, утвараліся вялізныя чэргі. Стаялі ў іх і дарослыя — атрымаць сваю порцыю адрэналіну не саромеліся і даяркі, і настаўнікі.

Каталіцкія Каляды мы заўжды адзначалі ў бабулі і дзядулі. У вёску, якая знаходзіцца ад нашай за тры кіламетры, ішлі ў любое надвор'е: і ў моцны мароз, і ў завіруху. Аднойчы столькі снегу насыпала, што было ні праехаць ні прайсці. Аднак «адступленне» нават не абмяркоўвалася. Напрасткі праз возера мы ішлі па глыбокіх гурбах, след у след за бацькам, які сваімі вялізнымі ботамі «пракладаў» нам шлях. Затое потым з такім апетытам елі вушкі, якія ніхто, акрамя маёй бабулі, так смачна не пёк: і з грыбамі, і з варэннем, і з макам. Падчас вячэры выцягвалі саломінкі з-пад абруса, загадвалі жаданні. Адбывалася дзіўнае таінства, якое вельмі збліжала нашу сям'ю.

Згадваецца і тое, як хадзілі з бацькам у лес па ёлку. Маці штогод прасіла: «Толькі маленькую!» Мы згодна ківалі галовамі і ўсё роўна выбіралі такую высокую, што дома ажно падразалі верхавіну, бо яна ўпіралася ў столь. А з якім нецярпеннем чакалі навагодніх ранішнікаў! Рыхтаваць касцюмы пачыналі, можа, за месяц да свят. Гэта цяпер выйшаў з крамы — і ты «зайчык» альбо «снегавічок». Раней жа касцюмы стваралі мы самі, з дапамогай бацькоў, вядома. Помню, як была Снежнай каралевай — спатрэбілася маміна вясельная сукенка (добра, што яна ў мяне маленькая). Пераўвасабляласяя і ў Блазна, і ў Сняжынку, і ў Снягурку — такую пачэсную місію ўжо на дарослай «ёлцы» давяралі мне ў старэйшых класах. А ў адну навагоднюю ноч да нас у акно пагрукаў сапраўдны Дзед Мароз — гэтак весела бавілі час калегі маёй мамы па школе. Ды самае смешнае было потым. Пакуль галоўны герой свята са сваёй «унучкай» сядзелі за нашым сталом, мой старэйшы брат схаваў мяшок з падарункамі. Праўда, потым прыйшлося яго вярнуць: іншыя настаўніцкія дзеці таксама чакалі цуду.

Чакалі яго і нашы бацькі. Ва ўсёй гэтай перадсвяточнай мітусні дарослыя на некаторы час таксама станавіліся дзецьмі. Рэдка калі мы адзначалі святы ў вузкім коле: ці то (а марозы былі моцныя!) ехалі да сваякоў у іншую вобласць, ці пешкі пляліся ў суседнюю вёску да дзядулі з бабуляй, ці то палова радні збіралася за нашым навагоднім сталом. Апошнім жа часам кожны сам па сабе (і гэта яшчэ задоўга да пандэміі!). Некаторыя нават ёлку перасталі ставіць (гэта ж колькі смецця!), а ў навагоднюю ноч ляпуюцца выйсці на двор, каб паглядзець салют.

Я не ведаю, як будзе сёлета: планаваць, асабліва ў наш час, — справа няўдзячная. Ёлку мы ўжо ўпрыгожылі (праўда, Цёмік пабіў дарагую нямецкую цацку!), пісьмо Дзеду Марозу напісалі, меню склалі. Засталося чакаць цуду, які абавязкова будзе ў Новым годзе!

Вераніка КАНЮТА.

Сямейная газета

Выпуск № 23 (159)

Тыя, хто побач

Аляксандр ЖЫХ:

«Дочкі робяць нашу сям'ю больш згуртаванай, дружнай, вясёлай»

Музыкант задаволены, што скончыліся гастролі і можна больш часу праводзіць з сям'ёй

Мультыінструменталіст і вакаліст, адзін з самых харызматычных музыкантаў «Песняроў» Аляксандр Жых з нядаўніх часоў экс-«пясняр». Гэтая акалічнасць яго не засмучае, бо ёсць праца, якая прыносіць задавальненне і прыбытак, а галоўнае — з'явілася больш часу на сям'ю.

— Як вы пазнаёміліся з жонкай?

— Гэта цікавая гісторыя. Знаёмства адбылося па ініцыятыве Асі. Гэта ўжо потым яна сказала мне, што спярша я ёй прысніўся. Потым мы ўбачыліся, калі яна ішла з сяброўкай у краму, а я — з крамы. Тады Ася сказала сяброўцы: гэты хлопец будзе маім мужам. А далей яна папрасіла агульных знаёмых даведацца, колькі мне гадоў, дзе працую і чым займаюся, ці ёсць у мяне дзяўчына. І вось аднойчы мы сустрэліся ў інтэрнаце сам-насам: я галіўся, а да іншага ўмывальніка падышла прыгожая-прыгожая дзяўчына і пачала мыць вінаград. Потым яна пад усялякімі нагодамі пачала да мяне заходзіць, і так паволі завязаліся нашы адносіны.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Выхаванне

КАЛІ БАЦЬКІ НЕ МАЮЦЬ РАЦЫІ

Тыповыя памылкі сучасных мам і тат

Не памыляецца толькі той, хто нічога не робіць. І выхаванне ўласных дзяцей — на жаль, не выключэнне з гэтага правіла. Бацькі таксама людзі, а значыць, неідэальныя, таму час ад часу дапускаюць промахі. Найбольш тыповыя памылкі бацькоў даўно вывучаны і апісаны дзіцячымі псіхолагамі — давайце паспрабуем іх пазбегнуць.

«Захваленае» дзіця

Мы ўжо засвоілі з рознай «мамскай» літаратуры, якую сучасныя мамы вывучаюць яшчэ на этапе цяжарнасці, што дзяцей трэба хваліць — гэта павышае самаацэнку і матывацыю маленькага чалавека. Але часам забываем простую ісціну: «Што занадта, то не здорава».

Хваліць дзіця трэба толькі заслужана. Не варта занадта засяроджвацца на любым дасягненні дзіцяці. Калі малы ўпершыню вымыў за сабой талерку або самастойна прачытаў урывак з дзіцячай кніжкі, зразумела, пахвала неабходная. Але калі гэта ўжо стала штодзённай, звычайнай справай, не варта захвальваць малога, бо дзіця вельмі тонка адчувае, ці сапраўды пахвала заслужаная, ці гэта своеасаблівая бацькоўская маніпуляцыя. Адчуўшы фальш, будзе чакаць узнагароды за любы свой добры ўчынак. У далейшым гэта можа прывесці да нежаданння наогул што-небудзь рабіць без узнагароды.

(Заканчэнне на 7-й стар. «СГ».)

«Першы парыў — збегчы»

Як лечаць алкаголікаў і наркаманаў у рэабілітацыйным цэнтры «Радуга»

Праз рэабілітацыйны цэнтр «Радуга» («Радасць. Духоўнасць. Гармонія»), дзе дапамагаюць справіцца з рознымі відамі залежнасцяў, за 13 гадоў існавання прайшло каля 1200 чалавек. Многім з іх сапраўды ўдалося змяніць жыццё — уладкавацца на работу, завесці сям'ю і доўгі час не ўжываць алкаголь ці псіхатропы. 28-дзённая праграма рэабілітацыі ўключае самыя дзейсныя на сёння методыкі псіхатэрапіі, якія паказалі сваю эфектыўнасць ва ўсім свеце. Праўда, і яны — не панацэя і могуць дапамагчы далёка не кожнаму.

30-гадовы мінчанін, апіятны наркаман, меў за плячыма некалькі турэмных тэрмінаў і ўсялякія парушэнні закона — і за наркотыкі, і за грабежніцтва. Некалькі гадоў таму ён прайшоў рэабілітацыйную праграму «Радугі» — і цалкам здолеў змяніць спосаб жыцця. У яго з'явіліся сям'я, работа, ён наведвае суполку ананімных наркаманаў — яе ўдзельнікі дапамагаюць адно аднаму ўстрымацца ад ужывання.

— Далёка не заўсёды можна ўгадаць, хто будзе выздараўліваць, а хто не, — расказвае **гештальт-тэрапеўт, кіраўнік рэабілітацыйнага цэнтра «Радуга» Аляксандр ФЁДАРАЎ *(на фота)*.** — Бывае, што на некаторых людзей вялікія надзеі: яны тэрапеўтычныя, усё адчуваюць і разумеюць, разумныя, адукаваныя, інтэлектуальныя. Але чамусьці зрываюцца — раз, другі — і знікаюць. А ёсць тыя, з кім, здаецца, няма сэнсу працаваць, бо вельмі мала шанцаў. А потым чалавек аб'яўляецца праз час: цвярозы і жыццё ў яго наладжваецца. Я згадваю адну жанчыну, яна была ва ўзросце за 45 гадоў. На першай кансультацыі моцна плакала, усё ў яе жыцці было развалена. Яе не паважалі, нават білі сваякі, здароўе было страчана. У мяне былі сумненні, ці дапаможа ёй «Радуга». Яе ўзялі, але без асаблівай надзеі. Потым, праз год, і праз два яна да нас прыходзіла — іншы твар, іншы позірк, бачна, што жыццё мяняецца і наладжваецца.

Суразмоўнік кажа, што, па некаторых ацэнках, кожны чацвёрты жыхар Мінска — залежны чалавек. Некалькі гадоў таму ў сталіцы толькі на афіцыйным уліку ў нарколагаў знаходзілася каля 50 тысяч алкаголікаў. Спецыялісты лічаць, што рэальныя лічбы ў дзесяць разоў большыя. Пры гэтым наяўнасць залежнасці далёка не заўсёды азначае, што чалавек дрэнна выглядае і вядзе асацыяльнае жыццё. Знешне ён можа быць цалкам паспяховы і пры гэтым мець сфарміраваную залежнасць.

Як правіла, у цэнтр звяртаюцца на другой стадыі алкагалізму і наркаманіі, калі ўжо маецца праблема неабходнасці пахмяліцца і запояў.

— На першай, эмацыянальнай, стадыі ўжыванне спіртнога вялікіх непрыемнасцяў не дастаўляе, але ў чалавека фарміруецца патэрн: калі нешта дрэннае здарылася, трэба крыху выпіць, і стане лягчэй. Алкаголь дае пэўнае расслабленне, калі не хапае ўпэўненасці ў сабе, лёгкую эйфарыю, свабоду кантактавання, — кажа Аляксандр Фёдараў. — На другой стадыі ўзнікае неабходнасць з раніцы пахмяліцца. У жыцці паступова з'яўляюцца непрыемнасці — чалавек дзесьці падае, траўміруецца, трапляе ў непрыемныя гісторыі, пачынаюцца бойкі, скандалы, канфлікты з праваахоўнымі органамі. Усё, здавалася б, і нічога, але на роўным месцы ўзнікаюць праблемы. З другой стадыі рэзка пачынае расці доза. Калі на першай гэта адбываецца амаль незаўважна, то на другой — лавінападобна.

Пасля надыходзіць этап плато, потым — спусканне з яго, калі арганізм пачынае разбурацца. Адбываецца рэзкае зніжэнне талерантнасці да алкаголю — чалавек не

ў стане выпіць столькі, колькі мог раней. Прычым доза хутка змяншаецца. На этапе спуску з плато людзі звычайна і паміраюць. Да трэцяй стадыі алкагалізму (а гэта поўная дэградацыя, калі амаль цалкам разбураны арганізм і дэградавала псіхіка — сумленне, сорам, віна чалавеку ўжо не ўласцівы) мала хто дажывае. Суразмоўнік адзначае, што наркаманы, у прыватнасці, паміраюць вельмі рана, у сярэднім каля 30 гадоў.

— Мала хто з іх дажывае да 40, да 50 — увогуле надзвычай рэдкі выпадак. Перадазіроўкі, няшчасныя выпадкі — арганізм, як правіла, не вытрымлівае, — кажа кіраўнік цэнтра.

Тых, хто прыходзіць у «Радугу» па ўласнай ініцыятыве, няшмат. Як правіла, чалавеку з залежнасцю камфортна ўжываць алкаголь ці наркотыкі, няхай нават ён мае з-за гэтага вялікія праблемы, у тым ліку і са здароўем. Як правіла, падштурхоўваюць да лячэння зацікаўленыя блізкія — жонка ці муж, дарослыя дзеці, сястра ці брат. Яны гатовы аплаціць рэабілітацыю, нягледзячы на тое, што вынік не гарантаваны, а супраціўленне самога залежнага можа быць вялізнае. Пры гэтым важна, каб сам залежны пагаджаўся на лячэнне.

— Рэабілітацыя складаецца з некалькіх этапаў, — тлумачыць кіраўнік цэнтра. — Першы — вывядзенне з запою, гэта медыкаментознае лячэнне, якое выконваецца ў спецыялізаваных медыцынскіх установах. Альбо чалавек сам вытрымлівае гэты этап. Першая наша ўмова перад паступленнем: гэта 10 дзён поўнай чысціні. Забаронены любыя псіхаактыўныя рэчывы, алкаголь, спіртазмяшчальныя лекі, транквілізатары, антыдэпрэсанты і снатворныя. Для наркаманаў абавязковы адмоўны экспрэс-аналіз на наяўнасць у арганізме наркатычных рэчываў.

Яшчэ адзін важны момант — першасная кансультацыя з псіхолагам. Тут ацэньваюць залежнага на адэкватнасць, высвятляюць яго матывацыю і тлумачаць умовы: як ён будзе жыць у рэабілітацыі і што мусіць рабіць. І хоць на першы погляд праграма рэабілітацыі «Радуга» нагадвае санаторную (заняткі псіхатэрапіяй, ёгай, арт-тэрапіяй, прагляд фільмаў), насамрэч гэта цяжкая штодзённая праца, якую, дарэчы, не ўсе вытрымліваюць.

Звычайна дзень пачынаецца ў 7.30. Дзяжурныя наводзяць парадак у блоку. З 9 да 10 раніцы праводзяцца заняткі індывідуальнай псіхатэрапіяй. Пасля сняданку з 10 гадзін пачынаюцца розныя віды групавой псіхатэрапіі — цялесна-арыентаваная, дынамічная, структураваная, — якая доўжыцца да самага вечара. Акрамя гэтага, праграма ўключае лекцыі, што расказваюць пра залежнасць, асаблівасці псіхікі такога чалавека і псіхалагічную абарону. Адводзіцца час на тэматычныя фільмы, а таксама вывучэнне 12-крокавай праграмы ананімных алкаголікаў. У восем гадзін вечара кансультанты (а гэта залежныя, якія доўгі час знаходзяцца ў рэмісіі і маюць вопыт выздараўлення) тлумачаць дамашнія заданні, і да сну трэба з імі справіцца. Напрыклад, падапечных просяць скласці спіс сваіх праблем ці ацаніць якасць жыцця, прааналізаваўшы па пэўных крытэрыях усё, што чалавек памятае.

У суботу ў цэнтр запрашаюць усіх блізкіх сваякоў, гэта таты, мамы, сёстры, браты, жонкі. Для іх свая праграма — цыкл лекцый па сузалежнасці, тэматычныя фільмы і мультысямейная псіхатэрапія, у якой таксама ўдзельнічаюць пацыенты і псіхолагі.

— Часта на такіх мерапрыемствах плачуць, здараюцца ўспышкі агрэсіі, лаянкі, але ў гэтым ёсць свой вялікі сэнс. Пасля таго як пражытыя крыўды, злосць, незадаволенасць, выказаны прэтэнзіі, можна пачынаць нармальны дыялог, — кажа Аляксандр Фёдараў.

Рэабілітацыйная праграма «Радуга» будуецца па мінесоцкай мадэлі, якая была створана ў ЗША ў 40-х гадах мінулага стагоддзя. Таксама тут прымяняюць праграму выздараўлення ананімных алкаголікаў «12 крокаў». І псіхатэрапію — асновай з'яўляецца гештальт-тэрапія, выкарыстоўваюцца элементы псіхааналізу, цялесна-арыентаваная тэрапія, арт-тэрапія, элементы псіхадрамы. Гэта самыя паспяховыя рэчы, якія найлепш дапамагаюць залежным.

— У нашай праграме адзін з важных акцэнтаў — на пачуцці чалавека. Бо калі ўстараняецца залежнасць, усплываюць пачуцці і перажыванні, якія чалавек імкнуўся знівеліраваць ці дапоўніць з дапамогай алкаголю ці наркотыкаў. І пытанне, як з гэтымі перажываннямі жыць цяпер. Гэта вельмі цяжка. А пачуцці цесна звязаныя з адчуваннямі ў целе. Калі чалавек саромеецца, ён чырванее. Калі яму страшна, ногі могуць стаць ватныя, маўленне — цяжкое. Калі чалавек злуецца, ён можа сціскаць кулакі. Мы вучым улоўліваць узаемасувязь паміж целам і пачуццямі. Калі яны не пражываюцца, то пачынаюць канцэнтравацца ў целе ў якасці пэўных заціскаў: пачынае балець галава, грудзіна, шыя, спіна. З часам адсюль пачынаюцца многія хваробы. Мы вучым пражыванню ўсіх пачуццяў: і радасці, і злосці, і цяпла. Акрамя таго, мноства практыкаванняў накіраваны на супрацоўніцтва паміж людзьмі, кантактаванне, давер. І сэнс не ў саміх практыкаваннях, а каб нешта пра сябе зразумець. Гэта магчымасць навучыцца па-новаму сябе паводзіць, напрыклад, выказваць канструктыўна сваю агрэсію, — падкрэслівае суразмоўнік.

Ён кажа, што група — гэта маленькая мадэль таго, што адбываецца ў «вялікім свеце». Адносіны паміж яе ўдзельнікамі розныя: хтосьці камусьці сімпатызуе, хтосьці не падабаецца. На рабоце, з сям'ёй, таварышамі чалавек сябе паводзіць гэтак жа, як у групе. Назіраючы за тым, як будуюцца адносіны, псіхолагі вывучаюць сваіх падапечных і займаюцца псіхакарэкцыяй.

Аляксандр Фёдараў не хавае, што першы парыў у некаторых залежных, якія трапілі ў цэнтр, — сысці. Што спыняе? Найперш грошы, бо праграма платная. Яны ўносяцца загадзя і не вяртаюцца. З 15 снежня рэабілітацыя тут каштуе 1250 рублёў. Яшчэ адзін момант — матывацыя. А гэта ў тым ліку і зацікаўленыя сваякі.

— Збегчы — гэта здацца. І куды збягаць? У найлепшае месца, якое мог, ён ужо трапіў, — заўважае Аляксандр Фёдараў. — Як правіла, падшыўкі і кадзіроўкі ўжо ўсе паспрабаваныя і не дапамагаюць. Усе сродкі выпрабаваныя, застаецца піць і калоцца да смерці. І тут пытанне, наколькі чалавек хоча жыць. Многіх выпускнікоў «Радугі» ўжо няма на гэтым свеце. З тых, хто праходзіць нашу праграму, рэмісіі больш чым у тры месяцы дасягае ўсяго 30—40 %, таму шанцы паправіцца ёсць ва ўсіх, а атрымліваецца толькі ў трэці.

Пасля рэабілітацыі пацыенты цэнтра адпраўляюцца ў самастойнае плаванне. Іх арыентуюць, што рэабілітацыя — гэта толькі штуршок, хоць і вельмі моцны. Але калі не падтрымліваць свае сілы і энтузіязм, яны хутка знікнуць, і пытанне часу, калі пацыент сарвецца. Сярод асноўных рэкамендацый — наведванне груп ананімных алкаголікаў (ананімных наркаманаў, ананімных гульняманаў). Дзякуючы настаўніку (а гэта чалавек, які мае пэўны вопыт і праводзіць па 12 роках духоўнага і псіхалагічнага развіцця, падказвае, дае пэўныя заданні), шанцы не ўжываць алкаголь даволі высокія. Яшчэ адна рэкамендацыя — псіхатэрапія.

— Ёсць шмат людзей, якімі мы ганарымся, яны папраўляюцца. У Мінску каля 30 груп ананімных алкаголікаў, і там нашых выпускнікоў нямала. 9 красавіка, у дзень нараджэння «Радугі», яны прыходзяць да нас, дзеляцца вопытам, расказваюць пра сваё жыццё. Многія не ўжываюць алкаголь і наркотыкі больш за дзесяць гадоў. Таму паправіцца цалкам рэальна, тут многае залежыць ад самога чалавека, — рэзюмуе Аляксандр Фёдараў.

Алена КРАВЕЦ.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.
Больш фота глядзіце на сайце zviazda.by

«ДОЧКІ РОБЯЦЬ НАШУ СЯМ'Ю БОЛЬШ ЗГУРТАВАНАЙ, ДРУЖНАЙ, ВЯСЁЛАЙ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Колькі доўжыўся перыяд заляцанняў?

— Да вяселля мы сустракаліся два гады, у нас былі доўгія перыяды расставанняў, звязаныя з тым, што Ася з'язджала працаваць па кантракце ў іншую краіну, а ў мяне — гастролі. Мы пастаянна стэлефаноўваліся, а калі атрымлівалася сустрэцца, то гэтыя хвіліны, гадзіны, дні былі на вагу золата.

«Дзеці, вядома, патрабуюць увагі, і трэба абавязкова адгукацца на іх запыты, каб дзяўчынкі адчувалі сябе любімымі і значнымі для бацькоў».

— Як спраўлялі вяселле, хто з артыстаў спяваў?

— На вяселле мы запрасілі сяброў, калег і родных. Вельмі рады, што амаль усе прыехалі, было каля 80 чалавек. Спярша мы вянчаліся, потым паехалі ў рэстаран і досыць весела і шумна адзначылі шлюб. Быў у нас вядучы, выступаў дуэт, які я вельмі люблю, — «Піва ўдваіх», кавер-гурт, нашы сябры з цыганскага ансамбля і, вядома, зараз ужо мае былыя калегі — салісты з «Песняроў». Дарэчы, яны былі з жонкамі, якія таксама спявалі. І я не стрымаўся — у нейкі момант выхапіў мікрафон, каб праспяваць коду ў «Волагдзе».

«Па маіх адчуваннях, вось тая знакамітая іскра, якая ўзнікае дзесьці ў пачатку адносін, у нас да гэтага часу не згасла».

— Музыкант і фатограф — два творчыя чалавекі ў сям'і. Ці лёгка вам ужывацца?

— Мне здаецца, для кожнай творчай натуры вельмі важна эмацыянальна выкладвацца, атрымліваць адабрэнне за сваю работу. Мы з Асяй адно аднаго пастаянна падтрымліваем, хвалім, але калі заўважаем нейкія няўдалыя моманты, абавязкова абмяркоўваем гэта. Вельмі важна, што мы з разуменнем ставімся да крытыкі ў свой адрас. Нам лёгка ўжывацца, таму што мы выдатна разумеем усе моманты прафесійнай дзейнасці адзін аднаго.

— Ці ёсць у кожнага з вас нейкія сталыя хатнія абавязкі?

— У побыце мы мякка і лаяльна ставімся адно да аднаго, разумеючы, што ў кожнага ёсць справы, якія важнейшыя, чым нейкія хатнія заняткі. Глядзець за дзецьмі, гатаваць, прыбіраць — тое, што мы дзелім на дваіх. Няма такога, каб былі нейкія назаўжды замацаваныя абавязкі.

— Як змянілася ваша жыццё з нараджэннем першай дачкі?

— Прызнаюся, з'яўленне першай дачкі адбылося некалькі пазней, чым мы планавалі. Калі яна нарадзілася, было неверагоднае шчасце. Стэфанія толькі ўмацавала нашы пачуцці адзін да аднаго, і, вядома, мора любові мы аддалі ёй. Так, наша жыццё змянілася, як, напэўна, і ва ўсіх маладых бацькоў, з'явілася шмат новых абавязкаў. Нам падабалася назіраць, як яна расце, робіць першыя крокі, гуляць з ёй — гэта радасць, а яшчэ трэба сачыць за здароўем, развіццём дзіцяці — вялікая адказнасць. Але нас гэта не напружвае, таму што мы марылі пра дзяцей.

— Звычайны бацькоўскі досвед: з першым дзіцем яны выконваюць усе рэкамендацыі, «запарваюцца» з кожнай нагоды, а з другім усё прасцей. А як склалася ў вашай сям'і?

— Нашы дзяўчынкі зусім розныя па характары. Сапраўды, над старэйшай дачкой мы сядзелі больш, яна больш пераборлівая, з малодшай усё прасцей. А цяпер і зусім выдатна: Сцеша з задавальненнем гуляе з Сафіяй, і ўжо дзеці дораць бацькам крыху вольнага часу. А наогул, дзеці, вядома, патрабуюць увагі, і трэба абавязкова адгукацца на іх запыты, каб дзяўчынкі адчувалі сябе любімымі і значнымі для бацькоў.

— Як вы рыхтавалі старэйшую дачку да з'яўлення сястрычкі?

— Сцеша сама нас прасіла, каб у яе была сястрычка або брацік. Больш ёй хацелася браціка, але калі сказалі, што будзе сястрычка, таксама не засмуцілася. Калі Сафія нарадзілася, Сцеша думала, што яна адразу ж будзе хадзіць, гаварыць, то-бок марыла аб зносінах на роўных. Сцеша цярпліва чакала, пакуль сястрычка падрасце. Цяпер яны ўжо могуць разам гуляць. Так што Сафія з'явілася на свет і па нашым жаданні, і па жаданні сястрычкі.

— Ці дапамагаюць з дзецьмі вашы бацькі?

— Пры першай жа магчымасці бабулі і дзядулі прыязджаюць да нас, праводзяць выхадныя, з задавальненнем займаюцца ўнучкамі. Заўсёды знойдуць магчымасць пабыць з імі, калі нам адначасова трэба ад'ехаць па справах. Скажу больш, нашы бацькі спецыяльна забіраюць да сябе на нейкі час унучак, каб мы маглі пабыць разам, адпачыць ад штодзённых абавязкаў і нават вярнуцца ў перыяд рамантыкі, заляцанняў. Вельмі ўдзячныя нашым бацькам за дапамогу і чуласць. Мы таксама любім наведваць іх.

— Даходы творчых людзей не заўсёды прадказальныя. Як плануеце сямейны бюджэт?

— Абавязкова нешта адкладаем, нешта трацім адразу. Абмяркоўваем чаргавасць расходаў, бо заўсёды ёсць тое, што можа пачакаць. Акрамя расходаў, як ва ўсіх людзей — харчаванне, камунальныя плацяжы, адзенне, цацкі, — нам яшчэ неабходна укладваць грошы ў прафесійны рост. Увогуле, у нас ёсць нейкая агульная скарбонка і ў кожнага свае асабістыя сродкі. Дапамагаем адно аднаму, калі ў мяне ці Асі пуста ў персанальным кашальку.

— Якія выдаткі ў вас у прыярытэце, а ад чаго можаце лёгка адмовіцца?

— Вядома, выдаткі на дзяцей. Калі ў нейкі перыяд складана з фінансамі, то эканоміць будзем на сабе.

— Расстанне з «Песнярамі» было нечаканым або, як кажуць, усё да таго ішло?

— Першы званочак быў два гады таму і звязаны з тым, што я актыўна працаваў як вядучы святаў. Гэта было паралельна з асноўнай працай, і ў пік вясельнага сезона некалькі разоў адпрошваўся з працы, што, натуральна, не падабалася нашаму мастацкаму кіраўніку. У той час я нават гатовы быў сам звольніцца, але нечакана калега вырашыў пакінуць калектыў, і, мабыць, расстацца адначасова з двума артыстамі кіраўніку аказалася цяжка. Таму было прынята рашэнне перавесці мяне на паўстаўкі, каб я мог удзельнічаць не ва ўсіх канцэртах. А расстанне адбылося ў верасні, калі скончыўся мой пяцігадовы кантракт.

— Шкадуеце пра страту статусу, нейкім стабільным заробку, ці бачыце ў гэтым новыя магчымасці для творчай рэалізацыі, што можа канвертавацца і ў добры прыбытак?

— На працягу апошніх сямі гадоў у мяне ёсць другая прафесія — вядучы святаў — даход, які я лічу асноўным. Так што ў фінансах я не моцна страціў. Але ў мяне з'явіўся час, таму што не трэба будзе ездзіць на гастролі, як было цягам 14 гадоў. Часам, калі прыязджаў дадому праз месяц-два, узнікала такое пачуццё, што табе даводзіцца вучыцца жыць наноў, прывыкаць да хатняга побыту, прывыкаць да жонкі, дзяцей, вяртацца да абавязкаў таты, мужа, гаспадара. Цяпер, вядома, разумею, што вялізны плюс у тым, што больш часу змагу надаваць сям'і. А статус... Моцнага шкадавання, калі шчыра, няма.

«У нас былі доўгія перыяды расставанняў, звязаныя з тым, што Ася з'язджала працаваць па кантракце ў іншую краіну, а ў мяне — гастролі».

— А можаце дзеля дабрабыту сям'і змяніць сферу дзейнасці?

— У мяне быў такі перыяд у 2011-2012 гадах, калі рыхтаваўся да вяселля. Паставіў сабе мэту — ніводнай капейкі не прасіць у бацькоў і не займаць у сяброў. Ася мяне ў гэтым падтрымала. Вырашылі, што я пайду працаваць у таксі, і я гэта сумяшчаў з гастролямі. Так зарабіў на вяселле. У прынцыпе, я гатовы ўзяцца за нейкую працу, далёкую ад творчасці, калі трэба для дабрабыту сям'і. І не выключаю, што давядзецца гэта зрабіць, бо з-за COVID-19 хтосьці адмяняе вяселле, хтосьці пераносіць яго на больш спрыяльны час. На канцэрты людзі таксама асабліва не ходзяць. Такі час... Але дзеці, сям'я не павінны ад гэтага пакутаваць.

— Як ваша сям'я любіць адпачываць?

— Да каранавіруса летам выязджалі на мора. Любім з дочкамі бываць на святкаванні дзён нараджэння іх сяброў і назіраць, як дзецям там добра, як яны ўжо ўмеюць будаваць зносіны з аднагодкамі. Часам вечарамі арганізоўваем хатнія канцэрты: я бяру гітару, дзеці — дудачкі, і выдатна праводзім час. А яшчэ мы ўключаем балетныя спектаклі. У дачок ёсць пачкі, яны надзяваюць іх і паўтараюць рухі за балерынамі. Гэта тая яшчэ забаўка! Усёй сям'і падабаецца сядзець каля каміна, а мы ў гэты час чытаем дочкам казкі.

«Мы з Асяй адно аднаго пастаянна падтрымліваем, хвалім, але калі заўважаем нейкія няўдалыя моманты, абавязкова абмяркоўваем гэта».

— Вопытны вядучы вяселляў неяк распавядаў, што ён ужо навучыўся прадказваць будучыню пары. А вы не адсочваеце, як складаецца жыццё тых пар, для якіх ладзілі свята?

— Напэўна, я яшчэ не настолькі вопытны. У мяне не атрымліваецца абстрагавацца і ставіцца да людзей як да звычайных заказчыкаў: сёння — адны, заўтра — іншыя. Звычайна трымаю ў поле зроку тыя пары, у якіх я вёў свята. Перажываю за іх. У дзень вяселля, калі я іх бачу, яны ў нейкай эйфарыі ад свайго шчасця, кахання. Потым, калі людзі дзеляцца сваім жыццём у сацсетках, радуюся, што ў іх усё добра. І потым з многімі з тых, у каго я праводзіў вясельныя ўрачыстасці, падтрымліваю сяброўскія адносіны. Не забываю віншаваць «сваіх» маладых з днём нараджэння, гадавінай вяселля, з нараджэннем дзяцей. Лічу, што калі я сціпла прыклаў сваю руку, свой голас да іх вясельнай урачыстасці, то маю права знаходзіцца дзесьці з імі побач у іншыя радасныя моманты іх жыцця.

— Зараз нікога не здзіўляюць пробныя, часовыя і іншыя разнавіднасці шлюбаў. А што, на ваш погляд, трэба для таго, каб шлюб быў моцны, а сям'я шчаслівай?

— Не вывеў яшчэ для сябе нейкую ідэальную формулу. Вельмі многае залежыць ад саміх людзей, ад розных знешніх фактараў, ад таго, наколькі гатовы клапаціцца пра дабрабыт сям'і. У нашым выпадку дапамагае тое, што мы з'яўляемся творчымі людзьмі і атрымліваем задавальненне ад сваёй працы, гэта важна. І, вядома, дзеці робяць нашу сям'ю больш згуртаванай, дружнай, вясёлай. Па маіх адчуваннях, вось тая знакамітая іскра, якая ўзнікае дзесьці ў пачатку адносін, у нас да гэтага часу не згасла.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.
Фота Вольгі БЯЖКОВАЙ і Кацярыны БУРДЗЕЕВАЙ.

БІЗНЕС З НАВУКОВЫМ

Генеральны дырэктар ПУВП «Праметэй» Анатоль ФЕДАРОВІЧ.

Знакамітае горацкае прыватнае прадпрыемства з гучнай назвай «Праметэй» робіць стаўку на перспектыўную для дзяржавы мясную жывёлагадоўлю

З наступаючымі навагоднімі святамі і Раством!

— Тое, што мы на працягу апошніх трох гадоў лідзіруем, агульная заслуга ўсяго калектыву. Летась нас нават прызналі найлепшай будаўнічай кампаніяй краіны. І мы вельмі даражым гэтым званнем. Сёлета мы распачалі зусім невядомы для нас від дзейнасці. Але, спадзяюся, калектыў мяне не падвядзе і мы з гонарам справімся з нашай новай місіяй. Я ўдзячны сваёй камандзе за тое, што мы адзіныя ў сваіх памкненнях і дзеяннях. Хацелася б пажадаць вам, мае паважаныя «праметэеўцы», і ўсёй нашай нацыі здароўя і спакою, каб не было насілля. Астатнія цяжкасці можна перажыць. Міру вашым сем'ям і нашай краіне!

Генеральны дырэктар ПУВП «Праметэй» Анатоль ФЕДАРОВІЧ.

Па выніках работы за мінулы год прадпрыемства «Праметэй» занесена на абласную Дошку гонару. У лідарах кампанія аказваецца не ўпершыню. Нават за межамі вобласці ведаюць, што гэта адзін з найлепшых забудоўшчыкаў у краіне. А хутка «Праметэй» заявіць пра сябе як сур'ёзная племянная гаспадарка па вырошчванні кароў мясной пароды, прычым з навуковым ухілам.

Праект дзяржаўнай важнасці

Стваральнік кампаніі і яе **генеральны дырэктар Анатоль ФЕДАРОВІЧ** не хавае, што год быў цяжкі і не вельмі спрыяльны для будаўніцтва. Адбыўся вялікі спад мантажна-будаўнічых работ. «Калі раней мы здавалі чатыры-пяць шматпавярховых дамоў у год, а ў лепшыя часы шэсць і нават сем, то сёлета толькі два — у Горках,» — уздыхае ён. Што датычыцца выпуску будаўнічых матэрыялаў, ёсць зніжэнне, але не вялікае. А вось па аказанні паслуг ёсць нават невялічкі рост да ўзроўню мінулага года. Шмат паслуг аказвалася калгасам.

Партфель заказаў на наступны год фарміруецца вельмі павольна. Кампанія працягвае ўдзельнічаць у тэндарах, але, як заўважае Анатоль Федаровіч, справы пакуль рухаюцца нясхутка. Калі раней на 1 снежня заказаў было на 70 %, то сёлета толькі на 10. Між тым, кампанія сваіх пазіцый не здае і працуе стабільна.

— Ніхто не ные, што цяжка, панікі няма, — кажа генеральны дырэктар. — Па вуліцах сцягамі, як некаторыя, не ходзім. Нам не да гэтых сумнеўных мерапрыемстваў. Для нас на першым месцы занятасць людзей. Вялікую ўвагу надаём ахове працы, бяспецы, наш сацыяльны пакет для працуючых не паменшыўся, застаўся такі, які і быў. Работы стала менш, але ў кампаніі ёсць запас трываласці. Шмат работнікаў, на жаль, хварэе — гэта ж будаўніцтва, людзі ўвесь час пад адкрытым небам. Але нават у такіх умовах мы не расслабляемся, пачынаем новы вельмі патрэбны дзяржаве праект — развіццё мясной жывёлагадоўлі.

Анатоль Федаровіч цалкам засяроджаны на сваім новым тварэнні. Усе ведаюць, з якім энтузіязмам ён можа аддавацца справе. Кампанія бярэцца рэалізаваць гэты грандыёзны праект і наладзіць вытворчасць прадукцыі мясной жывёлагадоўлі рэспубліканскага маштабу. Закуплена больш чым 400 галоў чыстакроўнай жывёлы абердзін-ангускай пароды, каб развіваць вельмі важны і перспектыўны бізнес. Але ёсць праблемы.

— Сёння мы маем вялікую патрэбу ў зямлі, — звяртаецца праз нашу газету да міністэрства сельскай гаспадаркі генеральны дырэктар кампаніі. — Зыходзячы з таго бізнес-плану пагалоўя, які ў нас ёсць, нам трэба як мінімум 2,5 тысячы гектараў зямлі. Нам далі толькі тысячу дваццаць,

Каманда праектнага бюро «Дэльта».

у тым ліку 500 гектараў пашы. І гэтыя 500 гектараў не здольныя пракарміць тую колькасць жывёлы, якая ў нас ёсць. З сакавіка наступнага года ў нас пойдуць ацёлы і да мая ў нас будзе каля 700 галоў. Нам трэба зарабляць абаротныя сродкі, каб чымсьці карміць жывёлу і даваць зарплату людзям. З просьбай аб выдзяленні дадатковых плошчаў мы звярнуліся да мясцовых уладаў і да міністра сельскай гаспадаркі. Ад вашага рашэння залежыць рэалізацыя праекта дзяржаўнай важнасці. І гэтыя землі нам патрэбны менавіта там, дзе знаходзіцца наш статак, — у Ленінскім сельсавеце.

— Мы вельмі спадзяёмся, што кіраўнікі, ад якіх усё залежыць, увойдуць у наша становішча, — перажывае Анатоль Федаровіч. — Мы не просім грошай, наадварот, мы не шкадуем на гэты важны аб'ект сваіх. У справу ўкладзена больш чым 15 мільёнаў рублёў і да мая плануем укласці яшчэ каля 10 мільёнаў. Закупілі 70 адзінак рознай тэхнікі — усё, што трэба для глебаапрацоўкі, нарыхтоўкі кармоў і ўборкі ўраджаю. Праект доўгаакупны. Акупіцца толькі праз сем гадоў.

Па схеме «Міраторга»

Праект вельмі сур'ёзны, яго навуковае суправаджэнне ажыццяўляе навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па жывёлагадоўлі на чале з генеральным дырэктарам, заслужаным работнікам сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь Мікалаем Папковым. Падключаная таксама Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія. Племянны рэпрадуктар будуецца з разлікам на тое, што студэнты Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі і Віцебскай ветэрынарнай акадэміі будуць праходзіць практыку ў Горках, а не ездзіць у Бранск. У адміністрацыйным будынку прадугледжана памяшканне для лекцыйных заняткаў.

— Праект распрацавалі самі. Некалькі разоў ездзілі ў камандзіроўку ў Расію знаёміцца з тэхналогіяй «Міраторга». Будзем працаваць па іх схеме, — удакладняе Анатоль Федаровіч.

— Сёння ў Беларусі гэтым сур'ёзна ніхто не займаецца. У нас жа ёсць гатовы цэх па перапрацоўцы мяса. Усе мантажна-будаўнічыя работы зроблены, засталося купіць абсталяванне. Налета плануем запусціць.

Галоўны заатэхнік СФГ «Вясна-Агра» Вольга КІСЯЛЁВА — спецыяліст высокага класа. Яна мае вопыт работы ў моцных сельскагаспадарчых арганізацыях Беларусі і Расіі, у тым ліку ў «Міраторгу», дзе была кіраўніком пляцоўкі. Гэта, дарэчы апошняе месца работы. Калі яе запрасілі ў аналагічную гаспадарку на радзіме, нават не раздумвала. На ёй адказнасць за ўтрыманне, кармленне і асемяненне набытых там жа, ў «Міраторгу», кароў.

Галоўны заатэхнік СФГ «Вясна-Агра» Вольга КІСЯЛЁВА.

— Мы закупілі 430 кароў абердзін-ангускай пароды і ўжо нарадзіліся восем цялят, — канстатуе Вольга. — У далейшым плануем займацца толькі чыстапародным развядзеннем, наш племянны рэпрадуктар разлічаны на пяць тысяч асноўнага пагалоўя, у тым ліку 2800 матачнага. Першы прыплод плануем атрымаць у канцы сакавіка.

Асаблівасць гэтай пароды ў тым, што яна лета праводзіць на пашы, а зімой знаходзіцца ў загонах пад адкрытым небам, або, як тут яшчэ кажуць, на «зімніку». Менавіта так утрымліваюцца мясныя жывёлы па сістэме «Міраторга». Гэтая парода прыстасаваная да суровых умоў — да зімы пакрываецца густой поўсцю, а вясной ліняе. Жывёлы асаблівыя, патрабуюць узмоцненага і збалансаванага кармлення, а таму кампанія паклапацілася, каб зрабіць неабходныя запасы кукурузнага сіласу, сенажу, спецыялізаваных камбікармоў. У якасці дабаўкі ідуць лізунцы з мікра- і макраэлементамі.

Статус племянной гаспадаркі абавязвае прытрымлівацца выразнай тэхналогіі. Жодзінскі навукова-практычны цэнтр курыруе мерапрыемствы па штучным асемяненні і далейшым суправаджэнні. Рацыёнам харчавання і ветэрынарным суправаджэннем займаюцца вучоныя Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі.

— А ўжо нашы спецыялісты сумесна з вучонымі будуць у далейшым навучаць спецыялістаў іншых гаспадарак асновам развядзення кароў мясной пароды, — удакладняе Вольга.

Кіраўнік кампаніі «Праметэй» сам падбірае спецыялістаў для работы на такім адказным участку. Нядаўна ездзіў разам з Вольгай Кісялёвай у Віцебскую ветэрынарную акадэмію, каб падабраць талковага маладога спецыяліста.

— Мы зацікаўленыя ў перспектыўных маладых людзях, — кажа галоўны заатэхнік. — Спецыяліст павінен быць граматным, але самае галоўнае — жадаць працаваць менавіта ў сельскай гаспадарцы.

Беларусы толькі тэарэтычна ведаюць, што такое мармуровае мяса. У краіне ніхто пакуль сур'ёзна яго вытворчасцю не займаецца. Нават у тых гаспадарках, дзе ёсць жывёлы мясной пароды, яны ўтрымліваюцца па прынцыпе малочных.

— Я была шмат у якіх беларускіх гаспадарках, але такога праекта, як у нас, няма ні ў кога, — канстатуе Вольга Кісялёва. — Гэта наогул нават не расійскі вопыт, а амерыканскі або аўстралійскі. Менавіта адтуль «Міраторг» завозіць жывёлу.

Лічыцца, што займацца мясной жывёлагадоўляй стратна, бо ў нашай краіне яшчэ не адпрацаваная сістэма спажывання такога мяса. Нават цана на яго вельмі заніжаная. Хоць яно не ідзе ні ў якае параўнанне з ялавічынай малочнай пароды. Апошняе вельмі поснае, каровы малочнай пароды разлічаныя больш на вытворчасць малака.

— Таму важна мець сваю перапрацоўку, — далучаецца да размовы **памочнік генеральнага дырэктара Сяргей ЯКАВЕНКА.** — У нас для гэтага ёсць мясны цэх. Яго распрацоўвалі тры праектныя арганізацыі — наша «праметэеўская» «Дэльта», польская «Холадінтэрнэшнл Плюс» і аўстрыйская «Берч-Ласка». Комплекс запраектаваны на атрыманне канцавога прадукту вельмі высокай дабаўленай вартасці. Будаўніцтва пачалося яшчэ на этапе праектавання. Магутнасць аб'екта 25 тон мяса на костцы ў суткі. Ужо запускаем тэхналагічнае абсталяванне. Яно ў нас нямецкае і польскае. Першую прадукцыю плануем выпусціць да Дня будаўніка — 10 жніўня.

Праект года

Праектнае бюро кампаніі «Праметэй» — «Дэльта» — тое самае месца, дзе ажыццяўляюцца самыя смелыя мары генеральнага дырэктара. Налета праектнаму бюро спаўняецца 15 гадоў, яго спецыялістам па сілах распрацаваць праекты самай неверагоднай складанасці. **Дырэктар бюро Таццяна ГАЙКЕВІЧ** згадвае, што аднойчы распрацоўвала нават гадавальнік для лясгаса. Аб'ектаў такога ўзроўню яшчэ не рабілі ў Беларусі, прыходзілася ездзіць па вопыт ў Расію. Сёлета гадавальнік пачаў працаваць і Таццяна вельмі ганарыцца, што мела дачыненне да яго распрацоўкі.

— На стадыі праектавання мне прыйшлося вывучыць, як растуць дрэвы і як іх трэба даглядаць, — расказвае яна. — Мы зрабілі прэзентацыю ў выглядзе 3D-мадэлі, па гадавальніку можна было віртуальна хадзіць і гуляць. Намеснік міністра лясной гаспадаркі і спецыялісты былі ў захапленні. Такога да нас яшчэ ніхто не рабіў.

УХІЛАМ

Брыгада Дзмітрыя ДУДАРАВА.

Аб'екты, распрацаваныя «Дэльтай», рэалізаваныя ў Магілёве, Оршы, райцэнтрах Магілёўскай вобласці. З таго, што пабудавана ў Горках за апошні час, 40 % — распрацоўкі «Дэльты», а калі лічыць, дзе яна выступала як падрадчык, дык амаль усе. Для праектавання комплексу па вырошчванні жывёл мясной пароды Таццяне Гайкевіч прыйшлося зноў ехаць па вопыт у Расію: у Беларусі аналагаў пакуль што не было.

Памочнік кіраўніка СФГ «Вясна-агра» Дзмітрый АБАЗОВІК.

— Усё, як звычайна, пачалося з ідэі Анатоля Іванавіча, — усміхаецца Таццяна. — Мы прывыклі, што ў нас усё заўсёды новае і перадавое. І комплекс для мясных жывёл кардынальна адрозніваецца ад звычайнай малочна-таварнай фермы. Паколькі мы будзем займацца племянным развядзеннем, трэба было прадугледзець, каб не адбылося перакрыжавання паміж жывёламі. Яшчэ адна асаблівасць у тым, што для гэтай пароды не трэба будаваць кароўнікі, дастаткова звычайных загонаў. Абаронай ад ветру служаць навесы. Адпаведна, прыплод расце таксама на вуліцы. Рэпрадуктар наогул — інавацыйная распрацоўка, бо там шмат нюансаў, з якімі прыходзілася разбірацца. Такога ў Беларусі не было, навацыя прыйшла з Расіі.

На вялікай схеме ўсё распісана да дробязяў. Уезд на тэрыторыю прадпрыемства ажыццяўляецца праз КПП. Тут жа дэзбар'ер для апрацоўкі транспартных сродкаў, вагавая, зернесушыльныя комплексы, сянажныя ямы, гаражы, навес для тэхнікі, склады для збожжа. Для водазабеспячэння аб'екта прадугледжана будаўніцтва дзвюх артэзіянскіх свідравін з воданапорнай вежай. Плануецца пабудаваць у межах адміністратыўнага будынка вучэбны клас на 25 чалавек. Будучыя маладыя спецыялісты Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі і Віцебскай ветэрынарнай акадэміі будуць мець магчымасць унікаць у асаблівасці вырошчвання гэтай жывёлы без адрыву ад вучобы. У Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, дарэчы, ёсць падобная вучэбная ферма для малочнай скаціны.

— З аграрабектамі мы раней практычна не працавалі, — адзначае Таццяна Гайкевіч. — І гэтым разам супрацоўнічалі з калегамі са спецыялізаванага праектнага інстытута. Аб'ект рабіўся ў вельмі сціслыя тэрміны. У маі ўжо прывезлі першых жывёл.

Дырэктар прызнаецца, што вельмі дапамагло тое, што ў бюро працуюць сапраўдныя прафесіяналы. І нават маладыя спецыялісты дэманструюць высокі ўзровень. Як інжынер-энергетык тут працуе Наталля Купрыянович, выпускніца Гомельскага тэхуніверсітэта імя П. Сухога. У кампанію яна прыйшла тры гады таму і адразу ж улілася ў каманду. Электрычную частку на новым аб'екце рабіла менавіта яна.

— Цікава было і вучыцца, і працаваць, — кажа Наталля. — Калі выконвала частку сваёй работы, як чалавек цікаўны ўнікала ў сутнасць усёй справы. Цяпер ведаю і пра асаблівасці кароў гэтай пароды.

«Абердзін-ангускі» адчуваюць сябе як дома

Разам з **памочнікамі генеральнага дырэктара Сяргеем ЯКАВЕНКАМ і Аленай ДЗЯГЕЛЬ** едзем на базу сялянска-фермерскай гаспадаркі «Вясна-агра», дзе ўтрымліваюцца тыя самыя «абердзін-ангускі». У рабоце гаспадаркі задзейнічаныя 50 чалавек. Частка пабудоў — КПП, складскія памяшканні, навесы для тэхнікі, вагавая і некаторыя іншыя — ужо зроблены. «Яшчэ нядаўна тут былі кустоўе і балота, бачыце, як мы ўсё акультурылі», — з гонарам кажа Сяргей Якавенка.

І сапраўды, аб'ект выглядае вельмі дагледжана. Тэрыторыя мехдвара ўся забетаніраваная, можна ў мадэльным абутку хадзіць. Матэрыяльна-тэхнічная база таксама ўражвае — найноўшыя камбайны беларускай вытворчасці, кормаўборачны нямецкі камбайн Claas Jaguar, пасяўны агрэгат Horsch Pronto з шасціметровай сеялкай і ёмістасцямі для ўнясення мінеральных угнаенняў, шмат іншых не менш высакакласных машын і агрэгатаў.

— І закупка тэхнікі працягваецца, — удакладняе **памочнік кіраўніка СФГ «Вясна-агра» Дзмітрый АБАЗОВІК.** — Мы спадзяёмся, што атрымаем для вядзення нашай гаспадаркі дадатковыя тэрыторыі. Зямля, якую трэба апрацоўваць, ёсць яшчэ і ў Мсціслаўскім раёне, але плошчаў усё роўна не хапае. Вытворчасць сельскагаспадарчых культур пастаўлена ў нас на сучасным узроўні. Пад гэтыя тэхналогіі набываецца і пасадачны матэрыял, і ўгнаенні, і сродкі абароны, і тэхніка. Для будучага сезона закуплены мабільныя запраўачныя комплексы. Гэта вельмі зручна і паскарае працэс. Набылі імпартную зернедрабілку, каб па прагрэсіўнай тэхналогіі драбіць кукурузу на корм жывёле. Для захавання гэтай культуры набылі сучасную ўпакоўку — поліэтыленавы рукаў. Рэч вельмі зручная, дазваляе эканоміць на сушцы зерня. На рукаў нанесены меткі, якія адзначаюць кожную тону прэсаванай кукурузы. У поўным аб'ёме нарыхтаваныя і кукурузны сілас, і сянаж. Сянаж, дарэчы, запакавалі ў плёнку, як таго патрабуюць сучасныя тэхналогіі.

У гаспадарцы ўжо прыступілі да падрыхтоўкі зернеўборачных камбайнаў да новага сезона. **Намеснік галоўнага механіка ПУВП «Праметэй» Сяргей ЛУК'ЯНАЎ,** акрамя сваёй асноўнай работы, яшчэ кожны год садзіцца за штурвал зернеўборачнай тэхнікі і паказвае высокі клас. Сёлета ён стаў лідарам уборачнай кампаніі.

Начальнік участка Міхаіл МАКАРСКІ.

Падчас нашага візіту ў гаспадарку, ён правяраў свой камбайн на спраўнасць.

Пакуль адны рамантуюць тэхніку, іншыя працягваюць будоўлю.

— Перад Новым годам збіраемся ўвесці ў строй рамонтную майстэрню — там прадугледжаны ўсе бытавыя ўмовы для работнікаў — душавыя, санвузлы, цёплыя распранальні, — працягвае знаёміць з гаспадаркай Дзмітрый Абазовік. — Адначасова вядзецца добраўпарадкаванне, пасаджаны пладовы сад. Пакуль на яблыневай плантацыі 324 дрэўцы, але плануецца пасадзіць яшчэ каля 700.

Дзмітрый Абазовік звяртае ўвагу на вагавую, якая аснашчана сучасным абсталяваннем — улік там вядзецца ў аўтаматычным рэжыме. Кожны кілаграм збожжа на ўліку. Збоку ад КПП — вялікае поле, якое таксама належыць гаспадарцы. На плошчы больш чым 40 гектараў пасеяны гібрыд жыта нямецкай селекцыі.

«Зімнік», месца ўтрымання незвычайных для нас пакуль кароў, крыху далей. Пад'язджаем да загонаў. Уздоўж агароджы цягнецца доўгая кармушка. Жывёлы стаяць каля яе ў шарэнзе, як салдаты — вельмі трапна параўнаў адзін з супрацоўнікаў. З-за сваёй доўгай поўсці і прыземістасці яны нагадваюць зуброў. Трактар, які развозіць для іх кармы, тут жартам называюць «мамкай». Бо як зачараваныя ідуць на яго сігнал.

Па дарозе заязджаем на будоўлю цялятнікаў і знаёмімся з адной з найлепшых брыгад кампаніі Дзмітрыя Дударава.

— Працуем у «Праметэі» васямнаццаты год, аб'ектаў шмат, усе розныя, — кажа Дзмітрый. — Я цясляр, але займаюся рознай работай. Наогул усе пяць чалавек у брыгадзе — прафесіяналы. Выконваем работы любой складанасці. І кіраўніцтва нас цэніць. Пастаянна атрымліваем прэміі і граматы.

Міхаіл Макарскі, начальнік участка, дзе поўным ходам ідзе будаўніцтва , запэўнівае, што лайдакоў у яго камандзе няма. Усе заданні выконваюцца якасна і своечасова.

— На гэты аб'ект мы прыехалі ў канцы мая, пачыналі з падрыхтоўкі тэрыторыі, — кажа ён. — Цяпер будуем рэпрадуктар для ўтрымання жывёлы. У рабоце занятыя каля ста чалавек.

Міхаіл Макарскі, дарэчы, будаўнік з вялікім стажам. Раней працаваў у ПМК № 1, пад яго кіраўніцтвам узводзіліся Лядовы палац у Горках, свінакомплекс на 24 тысячы галоў у вёсцы Перагон у Слаўгарадскім раёне, а таксама тры жывёлагадоўчыя комплексы ў Горацкім раёне.

З клопатам пра чалавека

Прэміі, ўзнагароды, падарункі — ПУВП «Праметэй» клапоціцца пра кожнага свайго работніка.

— У нас вельмі важкі сацыяльны пакет, — адзначае Сяргей Якавенка. — Да юбілею — прэмія, пры выхадзе на пенсію таксама — размер залежыць ад стажу работы і ўкладу ў развіццё прадпрыемства. Калі чалавек захварэў і больш за месяц адсутнічае, яму аказваецца матэрыяльная дапамога. Нават для членаў сям'і хворага прадугледжана падтрымка. Аздараўленне дзяцей — святая справа. Як, дарэчы, і дарослых. Калі чалавек пажадае адпачыць у якім-небудзь санаторыі, фірма ўсё аплаціць. За ўдзел у мерапрыемствах прадпрыемства кожны атрымлівае дадатковы працоўны дзень. На Дзень будаўніка, акрамя віншаванняў, атрымліваем прэміі. У залежнасці ад стажу работы зацверджаны медалі 1-й, 2-й і 3-й ступені: за 10 гадоў, 15 і 20 гадоў плённай працы на прадпрыемстве. Каля сотні чалавек ужо атрымалі гэтыя ўзнагароды.

Кампанія шмат увагі аддае спорту. На сваёй базе адпачынку «Мярэя», якая знаходзіцца ў гістарычнай мясціне на землях былога маёнтка князёў Раманавых у вёсцы Леніна Гарэцкага раёна, яна па некалькі разоў на год праводзіць спартакіяды.

— Усе, хто наведваюць гэта спартыўнае мерапрыемства, — і ўдзельнікі, і гледачы, могуць разлічваць на бясплатныя каву, гарбату, юшку, — удакладняе памочнік генеральнага дырэктара. — Усім, хто прыехаў на спартакіяду, гэты дзень залічваецца як працоўны. Пераможцы, акрамя грашовых прызоў, атрымліваюць у падарунак кулінарныя шэдэўры — запечанае парася, напрыклад.

— У нас праводзяць спаборніцтвы і іншыя прадпрыемствы, нядаўна быў «Малаказавод», — кажа **дырэктар базы адпачынку «Мярэя» Аляксандр ТАРАНАЎ.** — Усім падабаецца. Тут створаны адпаведныя ўмовы не толькі для заняткаў спортам, але і адпачынку. У нумарах усе выгоды: ёсць тэлевізар, мікрахвалёўка, электрачайнік. Дзень адпачынку каштуе 30-35 рублёў, а летам можна зняць асобны домік. Сумна ў нас не бывае. Ёсць магчымасць пагуляць у валейбол, дартс, летам адпачыць на пляжы каля прыгожага вадаёма Мярэя, а пры жаданні нават пакатацца па ім на катары. Дзецям вельмі падабаецца наш невялічкі заапарк са страусамі, паўлінамі і цацаркамі. Ёсць і іншыя птушкі і жывёлы — куры, качкі, гусі, коні, нават поні, авечкі, трусы. Для душы пабудавана невялічкая капліч-ка з купеллю. Гэта самае прыгожае месца ў Горацкім раёне. Адпачываць тут адно задавальненне.

Дабрачыннасць — перш за ўсё

Нягледзячы на няпросты год, кампанія эканоміць на дабрачыннасці не збіраецца. Па традыцыі навагоднія падарункі атрымаюць вучні чатырох гарадскіх школ у Горках і выхаванцы раённага цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі для дзяцей. З цэнтрам наогул цесныя сувязі, ім аказваюцца ўсе неабходныя паслугі па рамонце і ўзмацненні матэрыяльна-тэхнічнай базы. Дапамагае кампанія таксама прыёмнай сям'і з вёскі Пална. Пад патранажам «Праметэя» і аддзяленне кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў у вёсцы Леніна. Кампанія дапамагае з рамонтам, набыццём неабходнага абсталявання.

— Нам падабаецца, што «Праметэй» робіць гэта без усялякай там паказухі, — кажа **загадчык аддзялення Аляксей ЛАЗІЧНЫ.** — Анатолій Іванавіч Федаровіч асабіста прыязджае да нас і пытаецца, чым дапамагчы. Тэлевізар падарыў, альтанку пабудаваў, падарункі розныя нашым пастаяльцам перадае. Сярэдні ўзрост тых, хто тут жыве, 76 гадоў, а самы старэйшы наш жыхар — 1925 года нараджэння, і гэта заслужаныя работнікі, ветэраны працы. Для іх створаны ўсе ўмовы. Узмоцненае харчаванне, умовы для арганізацыі вольнага часу. Ёсць трэнажорная зала, арганізаваная дастаўка кніг, працуюць розныя гурткі — мастацкага чытання, мастацкай самадзейнасці.

Нэлі ЗІГУЛЯ, Алена ДАЎЖАНОК.
Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

УНП 700423316.

Дырэктар базы адпачынку «Мярэя» Аляксандр ТАРАНАЎ.

Святлана АГАРВАЛ:

«Нясіце дабро — і яно да вас абавязкова вернецца!»

Гэтым разам у госці да «Сямейнай газеты» мы запрасілі вядомую артыстку, сапраўдную прыгажуню, падобную на казачных прынцэс, адзіную ў Беларусі выканальніцу песень на хіндзі Святлану Агарвал. У інтэрв'ю пагаворым пра творчую дзейнасць спявачкі, яе сям'ю і захапленні, планы на будучае і многае іншае.

— Святлана, расскажыце, як з'явілася такое незвычайнае для беларускай эстрады амплуа?

— Я б не назвала яго такім ужо і незвычайным, хутчэй, эксклюзіўным *(усміхаецца)*. Усё пачалося яшчэ ў дзяцінстве, калі былі папулярныя індыйскія кінафільмы. Я іх вельмі любіла, асабліва музычны іх бок. Мне было вельмі цікава паходжанне гукаў, бо індыйцы спяваюць інакш, чым еўрапейцы. Я слухала гэтыя песні, старалася ўзнавіць, натуральна, не разумеючы слоў: што чула, тое і спявала. Так паступова маё дзіцячае захапленне перарасло ў прафесійную творчасць... А сёлета ў красавіку я сустрэлася са стваральнікам той самай песні «Джымі Джымі аджа», якую я напявала ў дзяцінстве і якая пазней стала маёй візітнай карткай, — Бапі Лахіры. Два месяцы ў Індыі прайшлі плённа: мы запісалі дзве песні, правялі сумесную прэс-канферэнцыю, запланавалі ўдзел у папулярным індыйскім тэлешоу і канцэрт у Маскве... Але ўмяшаўся каранавірус і крыху сапсаваў гэтыя планы. Чакаем, калі сітуацыя з пандэміяй палепшыцца, каб працягнуць наша супрацоўніцтва.

— Ці быў у вашым у дзяцінстве ідэал спявачкі?

— Як калісьці казала мая цётка — не стварыў сабе куміра. І ўсёткі ідэалам для мяне заўсёды была Ала Пугачова. Яна была і любімай выканаўцай маёй мамы. І ў памяць аб маме я часта выконваю на канцэртах адну з песень яе любімай спявачкі.

— Акрамя занятку музыкай, ці ёсць у вас якія-небудзь захапленні?

— Не так даўно я пайшла на курсы англійскай мовы. У школе і ва ўніверсітэце я вывучала нямецкую, а з англійскай неяк не складвалася. Пасля нараджэння сына таксама запісвалася на курсы і нейкі час наведвала, а потым закінула з-за недахопу часу. Хоць шмат чаго ў маўленні разумею, паколькі індыйцы вельмі любяць у размове змешваць словы з хіндзі і англійскай. Таму хочаш не хочаш, а зразумееш! У вольны ад эфіраў, здымак і канцэртаў час люблю схадзіць на фітнес альбо ў басейн, выехаць на прыроду, падыхаць свежым паветрам. І нават у гэтыя хвіліны я думаю над новымі песнямі і вобразамі.

— Вы прыгожая і разумная жанчына, паспяховая спявачка. Нярэдка гэтыя якасці выклікаюць негатыўныя эмоцыі, як на такое рэагуеце?

— Стараюся абстрагавацца, на ўсё глядзець з аптымізмам і знаходзіць толькі моманты са знакам «плюс», нават у адмоўных сітуацыях. Аднак у адносінах да сябе сустракала толькі станоўчы і добразычлівы настрой. Калі і ёсць благія эмоцыі — іх проста не трэба браць, не адказваць на агрэсію агрэсіяй. Нясіце дабро — і яно да вас абавязкова вернецца!

— Святлана, раскажыце, як вы трымаеце сябе ў форме? Раскрыйце сакрэт вашай прыгажосці.

— Тут усё проста — правільнае харчаванне ды спорт. Некалькі разоў на тыдзень стараюся наведваць фітнес-клуб, басейн і саўну і адчуваю сябе пасля гэтага цудоўна! Ем мяса, рыбу плюс агародніну, тварог, п'ю зялёны чай і каву з малаком. Вельмі люблю спалучэнне кавы і сыру раніцай — смаката!

Самае галоўнае — прывучыць сябе не есці ўвечары і дадаць хоць бы штодзённую хаду, таму што рух — гэта жыццё!

— Поспехі ў кар'еры — гэта, вядома, цудоўна, аднак жанчыне для поўнага шчасця неабходны каханы мужчына, дзеці. Раскажыце, калі ласка, пра вашу сям'ю.

— У мяне ёсць муж і сын, яны мая ахова і апора. Яны мае першыя слухачы і крытыкі новых песень і відэакліпаў. Мой муж Ашок займаецца бізнесам, вельмі ўважлівы і клапатлівы бацька і цудоўны сем'янін. Смачна гатуе стравы нацыянальнай кухні з індыйскімі спецыямі і навучыў гэтаму мяне. Павел, мой сын, скончыў лінгвістычны ўніверсітэт і цяпер валодае дзвюма замежнымі мовамі — англійскай і італьянскай. Прафесійна займаецца фатаграфіяй, іграе на гітары і добра спявае. А яшчэ ён аматар спорту. Сумесна з татам займаецца бізнесам, і гэта ў іх вельмі добра атрымліваецца.

— Святлана, раскажыце пра ваша вяселле, у вас было два святы — у Беларусі і ў Індыі?

— У Індыі вялікае значэнне надаецца вясельным абрадам — абходу свяшчэннага агню. Ён праводзіцца ў прысутнасці блізкіх сяброў і родных. Свяшчэннік запальвае сакральны агонь — Агні, які заклікаецца найвышэйшым сведкам заключэння шлюбу. Свяшчэннік чытае мантры, затым маладыя сем разоў абыходзяць вакол свяшчэннага агню, узяўшыся за рукі. Пасля таго як жаніх надзене на шыю нявесты залатую падвеску і паставіць сімвалічны знак на яе лбе, маладая лічыцца яго жонкай і часткай яго сям'і. А ў Беларусі было традыцыйнае вяселле: з дзявочнікам, застоллем, выкупам нявесты і кіданнем букета. Дзіўна, але букет злавіла мая сяброўка, якая потым таксама пабралася шлюбам з індыйцам.

— Ці ёсць у вашай сям'і традыцыі і святы, якія вы шануеце і адзначаеце абавязкова?

— Нароўні з беларускімі святамі мы адзначаем індыйскія. Вось не так даўно адзначылі свята Дзівалі (14 лістапада), якое яшчэ называюць «Святам агнёў». У гэты дзень прынята запальваць абрадавыя свечкі, дарыць адно аднаму падарункі і атрымліваць благаславенне ад бацькоў, пры гэтым гатаваць стравы з выкарыстаннем індыйскіх спецыяў. Таксама падчас свята ўсе дамы і ваколіцы ўпрыгожваюцца рознакаляровымі гірляндамі, людзі выходзяць на вуліцу, запускаюць вялікую колькасць феерверкаў. З беларускіх свят адзначаем Новы год — усё як мае быць: з аліўе, селядцом пад шубай, шампанскім і мандарынамі.

З мужам Ашокам Кумарам Агарвал.

— Індыя... Можаце расказаць пра сваё стаўленне да гэтай краіны? Паспрабуйце апісаць яе некалькімі словамі.

— Індыя — краіна кантрастаў, Балівуда, фарбаў Холі, спецыяў і... можна пералічваць бясконца. Індыя — краіна з багатай культурай і гісторыяй. Тут шмат незвычайнага: іншыя народнасці, шматвяковая культура, дзіўныя мовы, экзатычнае адзенне і разнастайнасць пейзажаў. У Індыі вельмі добразычлівы народ, усмешлівы і таварыскі.

— Святлана Агарвал на сцэне і ў звычайным жыцці — якая?

— На сцэне і па-за ёй я магу быць абсалютна розная. І там, і там я люблю людзей. Мне падабаецца несці радасць і пазітыў і прыхільнікам, і маім родным ды блізкім сябрам. Я радая, калі вакол людзі ўсміхаюцца і шчаслівыя. Мне падабаецца быць да гэтага датычнай. І ў жыцці, і на сцэне стараюся быць шчырай, а гледачы і навакольныя гэта адчуваюць.

— Ці ёсць што-небудзь, што можа вас вывесці з сябе?

— Я навучылася на ўсё глядзець спакойна, і мяне дастаткова складана раззлаваць. Я разумею, што калі мне не ўдаецца ўздзейнічаць на сітуацыю, я проста стараюся змяніць да яе адносіны.

— Што ў вашых планах?

— Я, напэўна, як і ўсе артысты, чакаю аднаўлення магчымасці ездзіць з канцэртамі па гарадах. Эпідэміялагічная сітуацыя, на жаль, зачапіла ўсе сферы жыцця, і культурную ў тым ліку. Стараюся з аптымізмам глядзець у будучае, запісваю новыя песні, хутка прыступаем да здымак новага кліпа, рыхтуем навагоднія тэлепраекты, канцэрты. Ідэй вельмі шмат, і я спадзяюся хутка парадаваць вас чым-небудзь цікавым.

P.S. *У гэтую нядзелю Святлана Агарвал прыме ўдзел у Міжнародным песенным конкурсе «Turkvision-2020», у якім прадставіць нашу краіну. Пажадаем ёй поспеху!*

Гутарыла Надзея ЗУЕВА.
Фота з асабістага архіва спявачкі.

КАЛІ БАЦЬКІ НЕ МАЮЦЬ РАЦЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Даследаванні паказваюць, што празмерная пахвала можа адмоўна адбіцца на фарміраванні асобы, — кажа **сямейны псіхолаг Кацярына АЛЁХІНА.** — У дзяцей, якіх занадта шмат хваляць, узнікаюць праблемы з завышанай самаацэнкай, і гэта прыводзіць да хібаў у зносінах з іншымі дзецьмі. Акрамя таго, аказалася, што дзеці, якіх бацькі пастаянна хваляць за розум і здольнасці, больш спісваюць на кантрольных і ў ходзе здачы тэстаў. Проста дзіця аказваецца не гатовае да правалу, яно перастрахоўваецца, таму што баіцца не апраўдаць чаканні бацькоў. Завышаныя чаканні мамы і таты — гэта сур'ёзны ціск на псіхіку дзіцяці або падлетка. Дзеці становяцца нервовыя, у іх узнікаюць складанасці з ацэнкай сваіх рэальных здольнасцяў. Каб дзіця вырасла здаровае, важна ў пытанні пахвалы знайсці залатую сярэдзіну.

Занадта шмат крытыкі

Адваротны варыянт — таксама вельмі шкодны для фарміравання дзіцячай псіхікі. Памылкі — гэта нармальна для людзей любога ўзросту, а асабліва — у перыяд сталення.

— Жорсткая крытыка за любую памылку прывядзе да фарміравання няўпэўненага ў сабе чалавека, залежнага ад чужога меркавання. Ці — іншы варыянт — перфекцыяніста, які імкнецца быць найлепшым ва ўсім, за што б ён ні браўся. Такі погляд на свет таксама не спрыяе развіццю гарманічнай асобы, бо самая малая памылка становіцца падставай для самабічавання, пачуцця ўласнай мізэрнасці і непатрэбнасці, — адзначае Кацярына Алёхіна.

Памылкі — гэта прыступкі, дзякуючы якім мы набываем вопыт, становімся больш сталыя і дасканалыя. Гэта галоўны тэзіс, які варта ўзяць на ўзбраенне бацькам, каб дапамагчы дзіцяці навучыцца менавіта так успрымаць свае памылкі. І яшчэ вельмі важна растлумачыць сыну або дачцэ, што памылкі можна і трэба выпраўляць.

Праекцыя бацькоўскіх мар

У юнацтве мама сур'ёзна займалася тэнісам і марыла аб спартыўных дасягненнях, але не атрымалася, нешта перашкодзіла — так часта бывае ў жыцці. А тата хацеў стаць мастаком, але паслухаўся сваіх бацькоў і паступіў вучыцца на інжынера. Але ж у іх ёсць дзеці — а значыць, яны дасягнуць таго, што аказалася не па сілах бацькам. І вось мама аддае дачку ў секцыю тэніса — не бяда, што той не цікава, «сцерпіцца-злюбіцца». А бацька настойвае на студыі малявання для сына, хоць таму значна цікавейшым здаецца, напрыклад, праграмаванне. Ну, ці футбол, не важна. Але ж дзеці — гэта не мы ў дзяцінстве, гэта іншыя людзі, з зусім іншымі талентамі, інтарэсамі і патрэбамі. І ў гэтым ім нельга адмаўляць.

— Праекцыя — падсвядомы механізм: бацькі пераносяць на дзіця свае асабістыя інтарэсы і патрэбы. Праекцыі працуюць несвядома, таму мамам і татам здаецца, што яны кіруюцца добрымі намерамі, — тлумачыць суразмоўніца. — Зразумела, здараецца, што інтарэсы дзяцей і бацькоў супадаюць. Але значна часцей гэтага не адбываецца. І тады дзеці вымушаныя ісці па выбраным для іх шляху, забываючыся на ўласныя жаданні.

Бацькам важна зразумець самім і дазволіць зразумець свайму дзіцяці, што той або тая — асоба, якая мае права на свой уласны выбар, сваё меркаванне і свае рашэнні.

«Цяплічнае» дзяцінства

Часам складана спрачацца з тым, што сучасны свет — не самае ўтульнае месца. Ён бывае халодны, бывае абыякавы, часам бывае нават страшны. У ім шмат адзіноты, смутку, боязі заўтрашняга дня. І, вядома, сваё дзіця так хочацца абараніць ад любога негатыву — ад непрыемнасцяў, страт, сумнага вопыту! Псіхолагі кажуць, што гэта — найбольш распаўсюджаная бацькоўская памылка сучаснасці.

— Каб выхаваць у маленькім чалавеку незалежную асобу, важна сфарміраваць у яго самастойнасць, уменне прымаць рашэнні, прагназуючы і ўсведамляючы іх наступствы, — адзначае сямейны псіхолаг. — Вы не зможаце заўсёды вырашаць яго праблемы, калі ён вырасце. Ды і ў дзяцінстве, як ні старайся, немагчыма цалкам засцерагчы дзіця ад любых непрыемнасцяў. Але імкнучыся трымаць дзіця «пад каўпаком» сваёй любові, бацькі пазбаўляюць яго неацэннага вопыту, які дапаможа яму ў будучыні.

Памятайце, што, акрамя любові, вашаму сыну ці дачцэ патрэбна і ваша павага. Паважаючы дзіця, трэба паважаць яго рашэнні. А задача бацькоў — навучыць сына ці дачку загадзя думаць пра наступствы гэтых рашэнняў.

Дваістыя стандарты

Усе мы ведаем, як правільна. Ведаем — і не робім. І пры гэтым хочам, каб дзіця рабіла так, як мы гаворым, а не так, як робім самі. Але маленькі чалавек больш арыентуецца на ўчынкі бацькоў, чым на іх словы. Калі мы заседжваемся за серыялам да чатырох гадзін раніцы, ці можна патрабаваць ад падлетка, каб у дзесяць вечара ён быў ужо ў ложку? Калі аддаём перавагу фастфуду, ці варта думаць, што сын ці дачка будуць харчавацца правільна? Калі гадамі не бяром у рукі кнігу, ці варта чакаць, што дзіця будзе чытаць класіку? І калі рэгулярна маем зносіны «на павышаных танах», ці трэба здзіўляцца, што малы таксама павышае на нас голас...

— Дзеці капіруюць бацькоў, прайграючы тыпы паводзін і эмоцыі, якія бачаць дома кожны дзень. Гэтая здольнасць і вучыць іх, як паступаць у той ці іншай сітуацыі, — адзначае псіхолаг. — Таму для поспеху выхавання так важны станоўчы бацькоўскі прыклад. Хочаце бачыць у сваім дзіцяці тыя ці іншыя якасці — значыць, вам прыйдзецца развіць іх у сабе. Дзеці (нават падлеткі, хоць і здаецца, што гэта не так) імкнуцца быць падобныя на сваіх бацькоў. Нават калі самі бацькі, паклаўшы руку на сэрца, не заўсёды гэтага хочуць. Таму так важна паступаць у адпаведнасці з тымі прынцыпамі, якія мы хацелі б данесці да сваіх дзяцей.

«Маленькі прафесар»

Будучыня дзяцей — галоўны фетыш сучасных бацькоў. Імкнучыся падрыхтаваць сваё дзіця да дарослага жыцця, бацькі хочуць усебакова яго развіць. Замежныя мовы, творчасць, спорт, паглыбленае вывучэнне школьных дысцыплін... Гэтая гонка пачынаецца літаральна з пялёнак. Кожная хвіліна распісана, і ў многіх сучасных дзяцей няма таго самага па сутнасці дзяцінства. Няма магчымасці пабегаць з сябрамі, памарыць, пачытаць або паглядзець тое, што цікава, а не тое, што задалі па школьнай праграме і на курсах дадатковай адукацыі.

На практыцы, адзначаюць псіхолагі, вынікам занадта актыўнага і ранняга навучання можа стаць псіхалагічная траўма. Бо доўгі час галоўнае, што неабходна для гарманічнага развіцця маленькага чалавека, — гэта гульня. Яна дапамагае набыць патрэбныя ўменні і навыкі. У сучасным свеце гульню ўжо на ранніх этапах развіцця дзіцяці дарослыя замяняюць паўнавартаснымі ўрокамі. У выніку дзіця адчувае стомленасць ад навучання і ўжо да першага класа прыходзіць з нежаданнем вучыцца.

— Многія бацькі шчыра лічаць, што «веды за плячыма не насіць», а значны інтэлектуальны багаж забяспечыць дзіцяці поспех у жыцці, — тлумачыць Кацярына Алёхіна. — Але аказваецца, што мноства гурткоў ды секцый і жорсткі тайм-менеджмент у дзяцінстве — зусім не гарантыя поспеху ў дарослым жыцці. Так, развіваючыя заняткі сапраўды развіваюць таленты дзіцяці. Але вельмі важна, каб і ў малога, і ў падлетка заставаўся час пабыць у сваім узросце. Занадта высокая інтэлектуальная і фізічная нагрузка не прыносяць карысці: веды не засвойваюцца, узнікае актыўнае адмаўленне вучобы наогул.

Калі ў вашага дзіцяці занадта насычаны графік, можа быць, лепш адмовіцца ад часткі нагрузкі. А час, які вызваліўся, выдаткаваць на сумесны адпачынак. Разам схадзіць у кіно ці з'ездзіць на прыроду, пачытаць або памаляваць. Бо ніякія рэпетытары не заменяць бацькоўскай любові і простых зносін, напоўненых ласкай і пяшчотай.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Мае правы

У БЕЛАРУСІ РАСПРАЦАВАЛІ НАСТОЛЬНУЮ ПРАВАВУЮ ГУЛЬНЮ

Цяпер дзеці, якія маюць інваліднасць, змогуць даведацца аб сваіх правах праз гульню. У яе можна будзе пагуляць у спецыяльных карэкцыйных цэнтрах рэспублікі і дамах-інтэрнатах для інвалідаў.

Дабрачыннае грамадскае аб'яднанне «Свет без межаў» выпусціла настольную гульню «Права маю». Яе мэта — расказаць дзецям на даступнай мове аб правах, якія дадзены ім ад нараджэння. Гульня распрацоўвалася ў рамках праекта «Ведаць, каб дапамагаць», накіраванага на падтрымку дзяцей з інваліднасцю і рэалізацыю іх правоў.

У дзіцячай настольнай гульні прадумана ўсё, каб удзельнікі на прыкладзе простых жыццёвых сітуацый запомнілі і навучыліся карыстацца правамі, якія ёсць у кожнага дзіцяці. Свой ход гулец пачынае з таго, што выцягвае «карту сітуацыі». Задача гульца — вызначыць, якое з правоў парушаецца ў апісанай гісторыі. У выпадку няправільнага адказу на поле выстаўляюцца фігуркі монстраў.

Пры распрацоўцы гульні ўлічваўся крытэрый даступнасці. Яна падыходзіць для дзяцей рознага ўзросту і розных кагнітыўных здольнасцяў. Гульня прадугледжана для дзяцей ад шасці гадоў. Для хлопчыкаў і дзяўчынак, якім больш за шэсць, можна выбраць узроўні з ускладненнямі — без калектыўнага прыняцця рашэнняў, магчымасці адказаць паўторна ў выпадку памылкі, падказак з назвамі правоў. Дзіця з інваліднасцю можа гуляць з падтрымкай дарослага — у такім выпадку памагаты не лічыцца гульцом.

— Гульня ствараласа ў першую чаргу для дзяцей з інваліднасцю, якія пражываюць у дамах-інтэрнатах, і спецыялістаў, што працуюць з імі, — сказаў вядучы спецыяліст ДГА «Свет без межаў». — Вельмі важна, каб самі дзеці ведалі, якія ў іх ёсць правы, а спецыялісты дапамаглі і навучылі практычнаму прымяненню гэтых правоў. У дамах-інтэрнатах для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця цяпер знаходзіцца каля 1400 дзяцей і маладых людзей ва ўзросце ад 4 да 35 гадоў. У кожнага дзіцяці, незалежна ад умоў пражывання, ёсць права на паўнавартаснае і шчаслівае дзяцінства, асабістыя правы, гарантаваныя нацыянальным і міжнародным заканадаўствам.

ДГА «Свет без межаў» перадалі настольныя гульні ў дзевяць дамоў-інтэрнатаў для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Таксама гульня даступная для карыстання ва ўсіх карэкцыйна-развіццёвых цэнтрах краіны. Цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі функцыянуюць ва ўсіх абласных і раённых гарадах Беларусі як установы спецыяльнай адукацыі для дзяцей з асаблівымі адукацыйнымі патрэбамі.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Новы год па-новаму

ЕЛКА Ў АРЭНДУ

Жывая елка ў арэнду — самы экалагічны варыянт навагодняга аздаблення. Вам прывязуць пушыстую прыгажуню дадому, а пасля свят адправяць далей жыць на плантацыі. Праз год вы зможаце ўзяць тую ж расліну. Тэрміны арэнды, правілы догляду за елкай і лёс дрэў «на пенсіі» мы абмеркавалі з Іванам Радзюкевічам, аўтарам праекту «Яловыя лугі».

— У снежні 2018 года я шукаў елку для сябе і, купіўшы дрэва ў вазоне, сутыкнуўся з вялікімі цяжкасцямі пры яе транспарціроўцы і пад'ёме ў кватэру. У гэты момант і паўстала ідэя арэнды елак. Першыя 150 раслін я купіў восенню 2019 года і не планаваў здаваць іх той жа зімой. Але сябры пераканалі мяне ў іншым, я ўсё ж рызыкнуў — каб праверыць попыт і выжывальнасць раслін. Зрабіў сайт і некалькі публікацый у сацсетках. Я планаваў здаць у арэнду дзесяць дрэў. Іх разабралі за пяць дзён.

Пазней некалькі чалавек напісалі мне, што ўжо купілі навагоднюю расліну ў вазоне і не ведаюць, што з ёй рабіць пасля свят, таму хацелі б аддаць яе нам. Гэта здалося мне выдатнай ідэяй, так у нас з'явіліся яшчэ 12 дрэў ад мінчукоў.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Усе елкі мы перасаджваем у аб'ёмныя кадкі. Большую частку года яны растуць, дагледжаныя, у вёсцы Ціневічы, а ўзімку цягам трох тыдняў радуюць гараджан. Мы пакідалі дрэвы на розны тэрмін і прыйшлі да высновы, што гэты — самы аптымальны. Калі трымаць дрэва ў кватэры занадта доўга, яно загіне.

Праз год прыжыліся не ўсе дрэвы і не ўсе выжылі пасля знаходжання ў кватэры. Таксама варта ўлічыць, што пасля 20-25 градусаў цяпла ў кватэры расліне трэба акліматызавацца і хаця б некалькі дзён пастаяць пры 5-10 градусах. Для гэтага мы ставім дрэўца ў памяшканне без аціплення, перш чым высаджваць на вуліцу.

Самая вялікая цяжкасць аказалася з дастаўкай дрэў. Мы выбралі кадкі па 35 л, а гэта каля 30 кг разам з грунтам і раслінай. Прывезці дрэвы з вёскі, а затым даставіць па адрасах і разнесці па кватэрах, ды яшчэ паўтарыць увесь працэс у адваротным парадку — задача няпростая.

У камплекце з дрэвам мы даём паддон, каб праз адтуліны ў вазонах паліваць расліну. Менавіта вільготнасць у памяшканні — самы важны элемент догляду за дрэвам. Елку трэба рэгулярна паліваць, трымаць далей ад ацяпляльных прыбораў і, па магчымасці, апырскваць ці трымаць побач з увільгатняльнікам.

Цяпер у нас 600 дрэў. Яны яшчэ занадта маленькія, каб здаваць іх у арэнду. У планах перасадзіць некалькі тысяч раслін. Хацелася б здаваць і двухметровыя яліны, але такія дрэвы складана перасадзіць, асабліва ў кадку. Таму нашы елкі для арэнды вышынёй каля метра, але яны абавязкова вырастуць. У нас ужо прасілі здаць менавіта тое дрэва, якое бралі ў мінулым годзе, бо цікава прыбіраць елачку і бачыць, як яна з кожным годам становіцца вышэйшая. А калі расліны перастануць змяшчацца ў кватэрах, іх можна будзе купіць і высадзіць на ўчастку. Астатнія мы збіраемся высаджваць у алею, але да гэтага чакаць яшчэ не менш за пяць гадоў.

Віталіна БАНДАРОВІЧ.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

Салата «Снегавік»

Спатрэбіцца: *бульба — 3 шт., печань траскі — 125 г, яйкі — 4 шт., плаўлены сыр — 100 г, морква — 1 шт., масліны — 2 шт., маянэз — 4 ст. л., зялёная цыбуля — 1 пучок, соль і перац — на смак.*

Адварыць і астудзіць бульбу, яйкі і моркву. Ачысціць іх.

Надраць на буйнай тарцы бульбу, выкласці першым пластом на вялікае плоскае блюда. Крыху пасаліць і паперчыць, надайць яму форму круга.

Печань траскі нарэзаць на дробныя кубікі, вылажыць зверху на пласт бульбы. Пасыпаць дробна насечанай зялёнай цыбуляй.

Аддзяліць жаўткі ад бялкоў. Першымі надзерці жаўткі, вылажыць іх наступным пластом, прамазаць маянэзам. Выразаць з моркві «носік» і «вусны», а астатнюю надзерці на тарцы разам з плаўленым сырам. Вылажыць гэтыя інгрэдыенты наступнымі. Пласт моркві старанна прамазаць маянэзам з усіх бакоў.

Бялкі надзерці на самай дробнай тарцы. Выкладзіце іх апошнім пластом на салату.

Масліны разрэзаць уздоўж на дзве палоўкі. Пакласці іх на месцы «вочак». Далей зрабіце «вейкі», «носік» і «вусны». Апошнія можна зрабіць чырвонага колеру з балгарскага перцу.

Накрыйце салату харчовай плёнкай. Пакіньце на нейкі час да падачы.

«Ёлка» са слоенага цеста

Румяная «ёлачка» са слоенага цеста, з салёнай або салодкай начынкай — простая ў прыгатаванні і вельмі смачная тэматычная навагодняя закуска.

Спатрэбіцца: *слоенае цеста — 1 кг (2 упакоўкі па 500 г), вяндліна ці бекон — 150 г, гарчыца — 0,5-1 ч. л., яйка курынае (жаўток) — 1 шт. для змазвання цеста, кунжут — па жаданні.*

Адмерайце ліст пякарскай паперы трохі большага памеру, чым форма або бляха для запякання. Выкладзіце папярэдне размарожанае цеста. Пры неабходнасці раскачайце яго да памераў формы або, наадварот, адрэжце лішняе. Адваротным бокам ляза нажа асцярожна, не праразаючы цеста наскрозь, нанясіце контуры будучай «ёлкі». Працаваць будзем з цестам, якое знаходзіцца ўнутры гэтага контуру. Прамажце паверхню цеста тонкім слоем гарчыцы, імкнучыся не выходзіць за акрэсленыя межы. Выкладзіце палоскі вяндліны ў два пласты. Важна, каб начынка была нарэзана вельмі тонка і была дастаткова гнуткая. У гэтым выпадку пры скручванні палосак цеста яна лёгка прыме зададзеную вамі форму.

Накрыйце начынку яшчэ адным пластом цеста і прыцісніце яго, адступіўшы прыкладна 0,5 сантыметра ад начынкі. Зрабіце контур «ёлкі» адваротным бокам нажа. Гэты невялікі запас месца без начынкі патрэбен для таго, каб была магчымасць шчыльна змацаваць паміж сабой лісты цеста. Цяпер, арыентуючыся на пазначаныя контуры «ёлкі», проста адрэжце ўсё лішняе цеста. Атрыманую нарыхтоўку змясціце ў халадзільнік на 15 хвілін. Калі цеста астудзіцца, зноў жа адваротным бокам нажа наносім абрысы ствала будучай «ёлкі». Ім стане палоска цеста ў цэнтры, якая будзе ўтрымліваць астатнія часткі цеста разам. Памер палоскі — прыкладна 1 сантыметр каля верхавіны, і тая паступова трохі расшыраецца да нізу «ёлкі». Цяпер наразаем цеста з двух бакоў ад «ствала» на палоскі аднолькавага памеру шырынёй каля 1 сантыметра. Далей скручваем кожную палоску два ці тры разы, каб атрымалася спіраль, і добра замацоўваем «канцы» цеста. Змяшчаем атрыманую «ёлачку» ў халадзільнік яшчэ мінімум на 15 хвілін, а тым часам разаграваем духоўку да 200 градусаў. Ахалоджанае цеста прамазваем яечным жаўтком, імкнучыся, каб жаўток трапляў толькі на яго, а не на начынку. Прысыпаем кунжутам. Выпякаем 20—25 хвілін.

Сушы-торт

Спатрэбіцца: *рыс для сушы — 300 г , ласось — 200 г, агурок — 100 г, тварожны сыр — 100 г, васабі — на смак, лісты норы — 2 шт., чырвоная ікра — 20 г.*

Нарэжце ласось кавалачкамі. Разлажыце на рабочай паверхні лісты норы, пастаўце зверху кольца ад формы для выпечкі і выкладзіце першы пласт «торта» — вараны рыс (можаце заправіць рыс рысавым воцатам). Рэшткі норы абрэзаць і парваць на невялікія кавалачкі.

Змяшайце тварожны сыр з васабі і раўнамерна размяркуйце палову масы ў якасці другога пласта «торта».

Нарэжце кубікамі агурок — гэта будзе трэці пласт.

Потым пакладзіце палову ласося, затым тварожны сыр, дадайце парваныя лісты норы, рыс, агурок і зноў ласось.

Упрыгожце «торт» чырвонай ікрой, кунжутам і зялёнай цыбуляй.

Зніміце кольца ад формы для выпечкі. Сушы-торт гатовы!

Кійкі з цеста

Імі можна цудоўна афарміць святочны стол, змясціўшы ў высокія шклянкі, упрыгожыць ёлку або падарыць сябрам і блізкім, прыгожа перавязаўшы стужачкай. Акрамя таго, гэтыя кійкі робяцца неверагодна хутка і лёгка. І яшчэ адзін плюс — для іх выдатна падыдзе слоенае цеста.

Спатрэбіцца: *цеста — 200 г, цукар — 3 ч. л., какава — 2 ч. л. (можна выкарыстоўваць карыцу, шакалад або здробленыя арэхі).*

Цеста размарозіць пры пакаёвай тэмпературы. Раскачаць у прамавугольнік. Таўшчыня — да 0,5 см. Змяшаць какаву з цукрам. Палову прамавугольніка шчодра пасыпаць сумессю какавы і цукру (ці іншай начынкай на ваш смак). Другой паловай цеста накрываем прамавугольнік, злёгку прыціскаючы ўсё рукой. Цяпер наразаем усё па даўжыні — палоскі павінны быць таўшчынёй не больш за 1 см. Цяпер кожную такую палосачку з двух кавалачкаў цеста і начынкі мы проста перакручваем, як бы пераплятаючы іх паміж сабой. І ў самым канцы злёгку загінаем адзін канец. Далей — на бляху, у духоўку, 190 градусаў, 5—7 хвілін і гатова!

СВЯТОЧНЫ НАСТРОЙ

ІДЭІ АЗДАБЛЕННЯЎ З ШЫШАК

Шышкі — ідэальная аснова для ёлачных цацак. Пафарбуйце шышку ў белы колер, намалюйце кропкі, дадайце іншыя дробязі і ў выніку атрымаеце якую-небудзь жывёліну або птушку.

Белы колер — заўсёды бяспройгрышны варыянт пры стварэнні шышак для дэкору. Такія аздабленні можна ставіць на камінную паліцу або на буфет, выкарыстоўваць пры стварэнні дэкаратыўных вянкоў і проста «раскідваць» па доме.

Белыя шышкі з чырвонымі капялюшыкамі раптам ператвараюцца ў гномаў! Такіх «гномікаў» можна размясціць на ёлцы ці проста ўпрыгожыць імі жыллё.

Шышкі добра спалучаюцца з іншай святочнай атрыбутыкай, напрыклад, са свечкамі. Вось так стол можа ўпрыгожыць практычна кожны.

ЯК ПАДРЫХТАВАЦЬ ГАНАК ДА ЗІМОВЫХ СВЯТ

Кветкі, што раслі ў чыгунах каля ганка, ужо засохлі, але можна стварыць кампазіцыі, якія нададуць ганку святочны выгляд і могуць прастаяць хоць да вясны, цешачы нас.

У сярэдзіну гаршка можна ўставіць разнастайныя галінкі. Можна пафарбаваць іх ва ўпадабаны вам і колер, напрыклад, у белы, залаты або сярэбраны. Вакол галінак раскласці яловыя «лапы».

Калі не хочаце высаджваць у гаршчок сапраўдную елку, то ў ім цалкам можна зладзіць ёлку штучную, створаную з гірляндаў.

ЯКІЯ МЫ ГАСПАДАРЫ, ТАКІЯ НАШЫЯ ДВАРЫ (Беларуская народная прыказка).

ТАЛІН НАПЕРАДЗЕ

Чаму Эстонія б'е рэкорды па беспрацоўі?

Паводле апытання жыхароў Эстоніі, якое двойчы на месяц праводзіць Міністэрства сацыяльных спраў, за час каранакрызісу стан трывожнасці ў грамадстве істотна ўзрос. «Згодна са снежаньскімі вынікамі, 75 працэнтаў рэспандэнтаў адзначаюць стрэс і напружанне, а 28 працэнтаў адчуваюць яго асабліва моцна. Падчас крызісу ўзровень стрэсу сярод насельніцтва ўзрос», — сказала ў інтэрв'ю аналітычнай перадачы ETV «Актуальная камера» галоўны спецыяліст аддзела па справах здароўя насельніцтва Міністэрства сацыяльных спраў Кэтлін Міківер, паведаміў err.ee. Адна з галоўных прычын — рэальныя апасенні страціць работу. Паводле афіцыйных даных, колькасць беспрацоўных у Эстоніі дасягнула рэкорднага паказчыка. Чаму краіна апынулася ў сумных лідарах?

БЕЗ ПАДТРЫМКІ

Паводле даных статыстычнага агенцтва Еўрасаюза Eurostat, занятасць сярод людзей ва ўзросце ад 15 да 24 гадоў у другім квартале ў параўнанні з першым скарацілася ва ўсіх краінах Балтыі. У Латвіі гэты паказчык знізіўся на 0,3 працэнта, у Літве — на 3 %, а ў Эстоніі — на 5,2 %. Самае вялікае скарачэнне занятасці сярод насельніцтва ва ўзросце ад 25 да 54 гадоў сёлета ў другім квартале было зафіксавана зноў-такі ў Эстоніі — мінус 3 працэнты. У Латвіі і Літве — мінус 0,2 % і мінус 1,9 % адпаведна. Паказчык занятасці сярод насельніцтва ва ўзросце ад 55 да 64 гадоў у другім квартале не змяніўся толькі ў Латвіі. У Літве ён знізіўся на 1,8 %, а ў Эстоніі — на 3,1 %.

Між тым, на дапамогу спадзявацца не выпадае. Нягледзячы на тое, што ў Эстоніі адзначаецца рэкордны рост беспрацоўя, дзяржава не плануе аказваць прадпрыемствам падтрымку накшталт той, якая дзейнічала вясной падчас першай хвалі каранавіруса, паведаміла err.ee. Старшыня Цэнтральнага саюза прафсаюзаў і савета Эстонскай касы па беспрацоўі Пеэп Петэрсан заявіў, што цяпер ва ўрада ёсць выбар: захаваць эканоміку ў адкрытым выглядзе ці ізноў пачаць выплачваць прадпрыемствам дапамогі, якія дзейнічалі вясной.

«Плаціць усім мы, мабыць, ужо не будзем, але мы маем намер падтрымліваць інвестыцыі — гэта значыць, тым прадпрыемствам, якія гатовыя зрабіць нешта новае, мы можам даць грошы», — пракаментаваў міністр эканомікі і інфраструктуры Тааві Аас. Паводле яго слоў, казаць аб сумах і тэрмінах пакуль заўчасна.

Каса па беспрацоўі арыентуецца на прагноз Міністэрства фінансаў, згодна з якім да новага года колькасць зарэгістраваных беспрацоўных вырасце да беспрэцэндэнтных 70 тысяч чалавек і застанецца такой да канца будучай вясны. Але гэта ў тым выпадку, калі ў Эстоніі абыдзецца без жорсткіх мер.

МОЛАДЗЬ ПАД УДАРАМ

Зніжэнне занятасці ў Эстоніі падчас вясновага крызісу было самым прыкметным сярод краін Еўрапейскага саюза, нягледзячы на меры кампенсацыі заработнай платы. Гэта азначае, што, трапляючы ў цяжкае становішча, эстонскія кампаніі пры неабходнасці смела прыступаюць да скарачэнняў персаналу, піша Postimees. «Рынак працы рэагуе на эканамічныя ўзрушэнні са спазненнем. Як у Эстоніі, так і ў многіх іншых краінах праграма субсідзіравання стрымлівала скарачэнне занятасці. Калі прыняць да ўвагі гэтыя абставіны, занятасць падчас гэтага крызісу моцна пацярпела, і можна сказаць таксама, што крызіс дасягнуў рынку працы адносна хутка», — заўважыла эканаміст Банка Эстоніі Арсоля Саасаарам, прадстаўляючы агляд рынку працы за другі квартал. Хоць у гэты перыяд эканоміка і занятасць пацярпелі і ў іншых краінах, тэмпы згортвання рынку працы ў Эстоніі былі аднымі з найвышэйшых у Еўрапейскім саюзе, заўважаюць эксперты.

Як паведаміла старшы эканаміст Swedbank Лійз Эльмік, сёлета ў трэцім квартале ўзровень беспрацоўя падвоіўся ў параўнанні з тым жа перыядам мінулага года. Больш за ўсё пацярпелі маладыя людзі ва ўзросце 15-24 гадоў, якія працуюць у сферы паслуг. Па

даных Касы па беспрацоўі, 37 % зарэгістраваных беспрацоўных раней былі альбо некваліфікаванымі рабочымі, альбо работнікамі сферы паслуг. 40 % беспрацоўных скончылі сярэднюю ці базавую школу — не маюць прафесійнай адукацыі.

Узровень працоўнай занятасці склаў у Эстоніі 66,3 %, узровень беспрацоўя — 7,7 %. Узровень працоўнай занятасці сярод жанчын склаў 62,5 %, а сярод мужчын — 70,3 %. Эксперты канстатуюць, што выкліканы пандэміяй каранавіруса эканамічны крызіс у Эстоніі ўсё больш уплывае на рынак працы, а вельмі верагодны ў цяперашняй сітуацыі новы лакдаўн разбурыць нават тыя сферы эканомікі, якія дзякуючы вясновай падтрымцы з боку дзяржавы і паслаблення ў летнія месяцы эпідэміі пакуль яшчэ хоць неяк трымаліся на плаве.

Перш за ўсё гэта турыстычная галіна і звязаныя з ёю сферы абслугоўвання. Ужо цяпер шматлікія турфірмы пачалі масавыя скарачэнні, а цёмныя вокны гатэляў і рэстаранаў сведчаць самі за сябе. Паколькі ў занятых у гэтай сферы кампаній грашовыя рэзервы канчаюцца, а звычайна галоўны сезон назапашвання сродкаў — калядна-навагоднія канікулы — у гэтым годзе па зразумелых прычынах не адбудзецца, можна меркаваць, што ўжо да вясны беспрацоўе стане адной з галоўных дзяржаўных праблем, якія цягнуць за сабой масу іншых.

Адпаведна, сама па сабе збіраецца вялікая колькасць пытанняў да ўлады. Наконт таго, як ён ацэньвае дзейнасць урада, член праўлення Саюза гатэляў і рэстаранаў Эстоніі Крысцьян Пеэске канстатаваў, што «турызм як асобная галіна эканомікі скінуты з рахунку. Кіруючы краінай урадавы кабінет сам ведае адказы на ўсе пытанні. Нават калі пытаюць меркаванне экспертаў, гэта робіцца для выгляду, а не з мэтай разумення праблемы. Шырокі пакет, прапанаваны Саюзам гатэляў і рэстаранаў Эстоніі, нават не сталі абмяркоўваць». Як паведаміла Kroonika, Крысцьян Пеэске адзначыў, што вялікая праблема заключаецца яшчэ і ў тым, што ніхто не ведае, які наступны план эстонскага ўрада і каго ён закране. «Наш урад набыў манаполію на праўду», — заўважыў ён, дадаючы, што вядучыя гатэльныя і рэстаранныя кампаніі Эстоніі нават разглядаюць магчымасць падачы судовага іску супраць дзяржавы.

ХВАЛЯ ЗВАЛЬНЕННЯЎ

Калі ж улічыць факт, што па дзеючым заканадаўстве ўстаць на ўлік на біржы працы з магчымасцю атрымліваць адтуль хоць нейкія выплаты могуць далёка не ўсе жыхары, то сітуацыя выглядае зусім ужо нярадасна. Афіцыйная статыстыка не адлюстроўвае рэальнай сітуацыі. Дарэчы, па даных Дэпартамента статыстыкі Эстоніі, неактыўных на рынку працы было ў трэцім квартале 277,2 тысячы чалавек.

Вядома, некаторыя з іх не працуюць па аб'ектыўных прычынах (вучоба, хвароба, траўма), але цалкам лагічна выказаць здагадку, што значную частку складаюць якраз тыя жыхары, у якіх проста няма законных падстаў для рэгістрацыі на біржы працы і атрымання адтуль дапамогі.

Характэрна, што пакуль рост беспрацоўя назіраецца не ва ўсіх сферах. Па відах эканамічнай дзейнасці самая высокая была занятасць у трэцім квартале ў апрацоўчай прамысловасці, аднак у параўнанні з тым жа перыядам мінулага года яна знізілася. А вось у будаўніцтве колькасць занятых нават павялічылася. Апошняе цалкам зразумела, бо на фоне крызісу ўжо запушчаныя да яго пачатку будаўнічыя праекты цяпер можна завяршыць з меншымі выдаткамі — пакінутыя без работы прадстаўнікі іншых сфер гатовыя працаваць тут за меншыя грошы.

Хуткі рост колькасці беспрацоўных у Эстоніі працягваецца беспрэцэдэнтна з пачатку верасня, калі ў краіне было зарэгістравана больш чым 47,5 тысячы чалавек, якія шукаюць работу. Мяжа ў 50 тысяч беспрацоўных была пераадолена 5 лістапада, а менш чым праз тры тыдні была перавышана 51-тысячная адзнака.

Эксперты лічаць, што пік эканамічнага спаду ў Эстоніі прыйшоўся на восень. Аднак негатыўныя тэндэнцыі працягваюцца. Гэта датычыцца і рынку працы. Эстонскі эканаміст Райва Варэ папярэджвае, што шэрагу кампаній усё роўна прыйдзецца звольніць частку сваіх супрацоўнікаў, і крызіс, справакаваны пандэміяй каранавіруса, адаб'ецца на іх ужо ў найбліжэйшы час. «Цяпер тыя фірмы, якія спадзяваліся гэта проста перажыць, пачнуць звальняць, — яны проста пачнуць закрывацца, і тады беспрацоўе да канца года ўзрасце, — заявіў ён Baltnews. — У другой палове снежня пачнецца святочны час. І да гэтага моманту ўсё пачне згортвацца, будуць звальняць работнікаў».

Зімой беспрацоўе працягне расці, адзначыла ў сваім эканамічным аналізе старшы эканаміст Swedbank Лійз Элмік, якую цытуе LETA. «Другая хваля каранавіруса будзе больш працяглая і цёмная», — заўважыла эксперт. З ёй згодная генеральны дырэктар Эстонскага інстытута кан'юнктуры Мар'е Ёзінг. У інтэрв'ю Eesti Paevaleht эксперт заявіла, што дзякуючы дзяржаўнай дапамозе на зарплату некаторыя прадпрыемствы адкладалі прыняцце рашэнняў аб скарачэннях, але гэтыя скарачэнні непазбежныя. «Скарочаныя работнікі атрымліваюць дапамогу ад Касы па беспрацоўі, але ёсць людзі, якія не могуць на яе разлічваць», — заўважыла кіраўнік Эстонскага інстытута кан'юнктуры, нагадаўшы, што ў краіне хапае тых, хто працуе неафіцыйна.

«Кансультанты па даўгах таксама прызнаюць, што павялічваецца колькасць людзей, якія бяруць хуткія крэдыты ці іншым чынам спрабуюць палепшыць сваё становішча з дапамогай няправільных метадаў. Мы не выйдзем з гэтага крызісу так лёгка, сітуацыя пагаршаецца», — пераканана Мар'е Ёзінг.

КОЖНЫ ДРУГІ ПРАЦАВАЎ ЗВЫШУРОЧНА

З іншага боку, аказалася, што кожны другі работнік у Эстоніі працаваў звышурочна. Як сведчаць вынікі праведзенага партала пошуку працы CVKeskus ее апытання з удзелам амаль 4500 чалавек з усёй Эстоніі, у гэтым годзе 51 % работнікаў выконвалі звышурочную працу. Крыху больш за палову (53 %) за тое, што працавалі звышурочна, атрымлівалі грашовую кампенсацыю, астатнія (47 %) выконвалі дадатковую работу бясплатна, паведаміла інфармагенцтва LETA.

Высветлілася, што больш за ўсё ў гэтым годзе працавалі звышурочна маркетолагі (61 %), будаўнікі (60 %) і работнікі сектара аховы здароўя (58 %). Менш за ўсё звышурочных гадзін прыпадала на асістэнтаў (41 %) і работнікаў сферы абслугоўвання (43 %). «Звышурочную работу ў многіх сектарах выклікаў з вялікай верагоднасцю крызіс у галіне аховы здароўя. Рэагаванне на выкліканы каранавірусам крызіс запатрабавала ад многіх работнікаў пастаяннай увагі і змены абавязкаў, узрасла неабходнасць замены калег, тым самым павялічылася рабочая нагрузка», — пракаментаваў даследаванне менеджар па маркетынгу CVKeskus.ee Хенры Аўвяэрт.

Нягледзячы на тое, што звышурочная работа ў аналагічным аб'ёме распаўсюджаная па ўсёй Эстоніі, у асобных рэгіёнах яна сустракаецца часцей — напрыклад, сярод людзей, якія працуюць у паветах Усходняй Эстоніі (56 %) і Паўднёвай Эстоніі (53 %). У сталіцы звышурочную работу выконвала крыху больш за палову работнікаў (51 %), а ў Заходняй Эстоніі — роўна палова.

Больш за ўсё бясплатна і звышурочна працуюць у Таліне — за адпрацаваны звыш належнага час даплату атрымлівалі менш за палову (47 %) сталічных работнікаў. Аднак ва Усходняй Эстоніі і Паўднёвай Эстоніі звышурочныя былі кампенсаваныя для 60 % работнікаў.

Пётр ДУНЬКО.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53, 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ООО «ДОМОЛЮКС»** (УНП 101380883) в лице антикризисного управляющего частного предприятия «Гетман и Партнеры», тел. +375 (17) 374-14-35.

Электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 310-18Б/2020 Экономический суд г. Минска будут проведены **18 января 2021 г. с 09.00 до 16.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

№ п/п	Предмет торгов, местонахождение	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС	Минимальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС
1	Изолированное помещение с инв. № 200/D-109894 (наименование: изолированное помещение № 3; назначение: помещение транспортного назначения) по адресу: г. Витебск, ул. Полярная, 2-3, площадь 322,4 кв. м	84 100,00	75 690,00
2	Изолированное помещение с инв. № 400/D-1738 (наименование: магазин; назначение: торговое помещение) по адресу: г. Гродно, ул. Горновых, 6, площадь 561,7 кв. м	719 500,00	647 550,00
3	Автомобиль грузовой специальный IVECO DAILY 35C15 фургон 2010 г. в., рег. знак АМ 9660-7, г. Минск, пр-т Независимости, 193	23 200,00	20 880,00
4	Погрузчик TOYOTA 02-6FDF15, серийный № 20297, г. Минск, ул. Бабушкина, 6	8 145,00	7 330,50

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.

Для участия в торгах необходимо в срок с 18.12.2020 г. с 09.00 по 15.01.2021 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов (подробнее на BELTORGI.BY). Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов – не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ

Лот 1: капитальное строение, инвентарный номер № 420/С-4284 (назначение – здание специализированного назначения, наименование – здание сепараторного отделения), расположенное по адресу: Лидский район, д. Белица. Составные части и принадлежности: ворота металлическая решетка на металлических столбах – инв. № 2063; ограждение из колючей проволоки – инв. № 2080; ограждение из металлической сетки – инв. № 2054.
Многолетние насаждения: береза – инв. № 9075; груша, 2 шт. – инв. № 9073, 9074; клен, 2 шт. – инв. № 90121; клен, 32 шт. – инв. № 90171; клен, 4 шт. – инв. № 9069; тополь – инв. № 9072; тополь, 4 шт. – инв. № 9071; ясень, 6 шт. – инв. № 9070.
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 423680400621000029, (назначение – для обслуживания Белицкого сепараторного пункта), площадью 0,9094, расположенном по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, д. Белица.
Начальная цена продажи – 25 114,80 руб. (двадцать пять тысяч сто четырнадцать рублей восемьдесят копеек) с учетом НДС.
Сумма задатка – 1 255 руб. (одна тысяча двести пятьдесят пять рублей)

Продавец – ОАО «Лидский молочно-консервный комбинат», г. Лида, ул. Энгельса, 116, Тел. 8-0154-52-33-56

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 19 января 2021 г. в 11.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion

Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 15 января 2021 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
https://grino.by/aukcion

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению КУП «СЛУЦК-ВОСТОК» (продавец)
в процедуре ликвидации юридического лица
проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:

Лот № 1: здание специализированное розничной торговли *(составные части и принадлежности: подвал)*, **инвентарный номер 640/С-29759, общая площадь 2501,8 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 624650100001006359** *(право постоянного пользования)* **площадью 0,4535 га по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Ленина, 237.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 2 250 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **225 000,00** бел. руб.).

Объект находится в залоге у ОАО «Белагропромбанк» по договору об ипотеке. Объект обременен договорами аренды: по 01.02.2024 (813,5 кв. м), по 31.12.2020 (18,3 кв. м), по 02.03.2021 (22 кв. м), по 31.03.2021 (19,9 кв. м), сведения у организатора аукциона.

Лот № 2: изолированное помещение (магазин № 39), инвентарный номер 640/D-69433, общая площадь 165,9 кв. м, расположенный на 1-м этаже многоквартирного жилого дома по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Гагарина, 7-61. Земельный участок с кадастровым номером 624650100001000914 площадью 0,1343 га *(общее долевое право постоянного пользования, доля в праве 1/5)*.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 185 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **18 500 ,00** бел. руб.). *Объект обременен договорам аренды по 31.12.2021.*

Лот № 3: изолированное помещение (помещение магазина), инвентарный номер 640/D-70034, общая площадь 213,8 кв. м, расположенное на 1-м этаже многоквартирного жилого дома по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Социалистическая, 142-60. Земельный участок с кадастровым номером 642500000001000431 площадью 0,1595 га *(общее долевое право постоянного пользования, доля в праве* 8/25).

Объект обременен договорам аренды по 01.05.2021, сведения у организатора аукциона.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 252 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **25 200,00** бел. руб.).

Лот № 4: изолированное помещение (административно-торговое помещение магазин № 60) (составные части и принадлежности: подвал, пристройка), инвентарный номер 640/D-27989, общая площадь 244,3 кв. м, расположенное на 1-м этаже многоквартирного жилого дома по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Ленина, 313.

Объект обременен договором аренды по 31.12.2023, сведения у организатора аукциона.

Начальная цена с НДС (20 %) – **264 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 26 400,00 бел. руб.).

Лот № 5 (повторный): здание специализированное розничной торговли, инвентарный номер 640/С-29757, общей площадью 231,7 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 624650100001006298 площадью 0,0523 га *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Виленская, 106.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 252 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **25 200,00** бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ о внесении суммы задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: юр. лицом РБ – копии устава со штампом о проведении гос. регистрации, свидетельства о гос. регистрации их подлинники для заверения копий, доверенность представителю юр. лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юр. лица; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юр. лица или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; индивидуальным предпринимателем РБ – копия свидетельства о гос. регистрации и подлинник для заверения копии; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного физ. лица, индивидуального предпринимателя – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в торгах физ. лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физ. лица, индивидуального предпринимателя, юр. лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов соглашение.

